ДУ «ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА»

Аддзел краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Інфармацыйнае паведамленне

I КВАРТАЛ

Віцебск 2019

ДУ "ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА"
Аддзел краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

I квартал

2019

Інфармацыйнае паведамленне

ВІЦЕБСК
2019

УДК 008
ББК 71.41(4Беи–4Вит)
К90

Складальнік *Т. В. Пацалуёнак*
Рэдактар *Н. В. Ціпанава*
Адказны за выпуск *Т. М. Адамян*

Культурнае жыццё Віцебскай вобласці : I квартал 2019 года : інфармацыйнае паведамленне / ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», Аддзел краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі ; [склад. Т. В. Пацалуёнак]. – Віцебск, 2019. – 66 с.

Штомесячнае інфармацыйнае паведамленне разлічана на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне.

Прызначана для спецыялістаў інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцаў, выкладчыкаў, студэнтаў і іншых катэгорыяў карыстальнікаў.

© ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», 2019

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

І квартал 2019

Інфармацыйнае паведамленне

Складальнік **Пацалуёнак** Таццяна Віктараўна

Адказны за выпуск Т. М. Адамян

Камп'ютарная вёрстка А. В. Юпатавай

Надрукавана на ксераксе ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна»

210601, г. Віцебск, вул. Леніна, д. 8а

E-mail: kray@vlib.by, vlib@vlib.by

ПРАДМОВА

«Культурнае жыццё Віцебскай вобласці» – штомесячнае інфармацыйнае паведамленне, разлічанае на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне. Выданне можа быць карысным спецыялістам інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцам, выкладчыкам, студэнтам і іншым катэгорыям карыстальнікаў.

Пастаянная рубрыка «Хроніка падзей» уключае аналітычна перапрацаваную інфармацыю, падрыхтаваную па матэрыялах абласной газеты «Витебские вести», гарадскіх і раённых газет Віцебскай вобласці за перыяд з 1 студзеня па 31 сакавіка 2019 года, і ўтрымлівае звесткі, прадастаўленыя Віцебскім абласным метадычным цэнтрам народнай творчасці і цэнтральнымі бібліятэкамі вобласці.

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

КУЛЬТУРА

АГУЛЬНЫЯ ПЫТАННІ КУЛЬТУРЫ

Былы загадчык аддзела культуры Аршанскага райвыканкама **Валянціна Васільеўна Барысава** адзначыла 90-гадовы юбілей. Яна ўнесла вялікі ўклад у развіццё культуры Аршаншчыны, атрымала ганаровае званне «Заслужаны работнік культуры БССР» першай сярод загадчыкаў раённых аддзелаў культуры Віцебскай вобласці. Юбілейная вечарына была арганізавана ў Аршанскай бібліятэцы імя А. С. Пушкіна. Падзякі, Ганаровыя граматы, кветкі і падарункі юбіляру ўручылі прадстаўнікі раённых улад, прафсаюзаў і ветэранскіх арганізацый; гучалі песні, вершы, добрыя пажаданні. Валянціна Барысаўна і зараз не сядзіць без справы – спявае ў Зубаўскім народным хоры, які вядомы далёка за межамі Аршаншчыны. (*Аршанская газета. – 2019. – 10 студз. – С. 4.*)

8 лютага ў канцэртнай зале «Віцебск» адбылася ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання лаўрэатаў ганаровага звання «Чалавек года Віцебшчыны-2018». Лаўрэатамі звання сталі і прадстаўнікі галіны культуры і мастацтва: **Аліна Віктараўна Быкава** – выкладчык па класе цымбал установы адукацыі «Віцебскі дзяржаўны музычны каледж імя І. І. Салярцінскага», **Алеся Іванаўна Аўчыннікава** – дырэктар Бешанковіцкага раённага Дома рамёстваў ДУК «Бешанковіцкі раённы цэнтр культуры». Госці свята пазнаёміліся з выставамі кніг і фотадакументаў, якія падрыхтавалі Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна і Віцебскі абласны краязнаўчы музей да 100-годдзя ўтварэння БССР. Экспазіцыя Цэнтра культуры «Віцебск» была прысвечана Міжнароднаму фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». На выставачных стэндах СМІ быў прадстаўлены патэнцыял прамысловых

11–14 снежня ў французскіх гарадах Парыж, Ліён і Клярмон-Фяран былі праведзены «Навагоднія ялінкі» для прадстаўнікоў беларускай дыяспары. Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь тэатр танца «Прэм’ер-Спонайд» Цэнтра культуры «Полацк» за ўдзел у мерапрыемстве быў адзначаны ў падзячным пісьме з Пасольства Рэспублікі Беларусь у Францыі на імя старшыні Полацкага райвыканкама М. Шаўчука. (*Полацкі веснік. – 2019. – 9 студз. – С. 4.*)

Напярэдадні Новага года на сцэне Талачынскага раённага Цэнтра культуры і народнай творчасці адбылася прэм’ера спектакля «Як Насцечка ледзь Кікімарай не стала», пастаўленага рэжысёрам народнага тэатра Святланай Васільевай. (*Наша Талачыншчына. – 2019. – 12 студз. – С. 12.*)

ФОТАМАСТАЦТВА

10 студзеня – 10 лютага ў Музеі гісторыі і культуры Наваполацка экспанавалася выстава аўтарскіх работ фотамастака Эрнэста Цецярэўскага «50х50».

«Мы з Беларусі» – удзельнікі гэтага фотапраекта, члены фотаклуба «Цафон» з ізраільскага горада Хайфа ў трэці раз прадставілі фотавыставу ў Культурна-гістарычным комплексе «Залатое кальцо горада Віцебска «Дзвіна».

Да Дня абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь у Сянно быў арганізаваны фотаконкурс «Сапраўдны мужчына-2019».

прадпрыемстваў. Завяршыў урачыстасць вялікі святочны канцэрт з удзелам творчых калектываў і выканаўцаў Віцебшчыны, фольк-групы «Неруш», папулярнага расійскага спевака Дзяніса Майданава.

18 лютага адбылася калегія Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь у г. Мінску. Начальніку аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Лёзненскага райвыканкама **Таццяне Аляксееўне Шульган** быў уручаны нагрудны знак «За уклад у развіццё культуры Беларусі» (*Сцяг перамогі. – 2019. – 19 лют. – С. 1–2.*)

26 лютага ў Верхнядзвінскім цэнтры культуры і народнай творчасці адбылося пасяджэнне калегіі ўпраўлення культуры Віцебскага аблвыканкама. У ім прынялі ўдзел намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь С. І. Шарамецьеў, начальнік упраўлення культуры П. М. Падгурскі, спецыялісты ўпраўлення культуры, начальнікі аддзелаў ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі, аддзелаў культуры райгарвыканкамаў, дырэктары абласных устаноў культуры, культработнікі вобласці. У ходзе калегіі былі абмеркаваны вынікі работы галіны культуры Віцебшчыны ў 2018 годзе і задачы на 2019 год. Ганаровымі граматамі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, упраўлення культуры Віцебскага аблвыканкама, Віцебскага абласнога камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму былі ўзнагароджаны лепшыя прадстаўнікі сферы культуры вобласці. Удзельнікі калегіі наведалі выставы-прэзентацыі, іх увазе былі прапанаваны відэафільм пра Верхнядзвінскі раён і канцэрт творчых калектываў раёна. (*Дзвінская праўда. – 2019. – 5 сак. –С. 1.*)

Два прадстаўнікі Віцебшчыны ўвайшлі ў лік пераможцаў рэспубліканскага конкурсу «Чалавек года ў сферы культуры» па выніках 2018 года. Кіраўнік народнага тэатра лялек «КапялюШ» Наваполацкага Цэнтра рамёстваў і традыцыйнай культуры **Андрэй Рэцікаў** удастоены ганаровага звання ў намінацыі «Народная творчасць». Загадчык Дома ганчара філіяла Шаркаўшчынскага раённага Цэнтра культуры **Сяргей**

Рымдзёнак адзначаны ў намінацыі «Народнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва». (*Витебские вести. – 2019. – 21 февр.– С. 20.*)

Арганістка канцэртнай залы Сафійскага сабора Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка **Ксенія Максімаўна Пагарэлая** ўдастоена звання «Заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь» за высокія дасягненні ў прафесійнай дзейнасці, значны ўклад у развіццё айчыннай культуры і папулярызацыю музычнага мастацтва краіны за мяжой.

Мастацкі кіраўнік вакальна-харэаграфічнага ансамбля танца, музыкі і песні «Талака» Віцебскай абласной філармоніі **Мікалай Мікалаевіч Падаляк** удастоены звання «Заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь». Створаны ім у 1993 годзе ансамбль адметны высокім узроўнем выканальніцкага майстэрства, займае годнае месца сярод прафесіянальных калектываў Беларусі і папулярны далёка за яе межамі.

Дырэктар Сар'янскага СДК Верхнядзвінскага раёна **Алена Іванаўна Мінчанка** абрана «Жанчынай года Віцебшчыны-2018» у намінацыі «Духоўнасць і культура».

Па выніках рэспубліканскага конкурсу «Горад культуры», арганізаванага Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь, аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам, дыпломам пераможцы ў намінацыі «Лепшы горад раённага падпарадкавання» за дасягненні ў 2018 годзе ўзнагароджаны горад **Глыбокае**.

У **сакавіку** было праведзена выніковае пасяджэнне Савета аддзела культуры Віцебскага гарвыканкама. Яно прайшло на базе Дзіцячай школы мастацтваў № 3 «Маладзік», на фоне выставы работ настаўнікаў мастацкага аддзялення школы «Мастак-педагог». (*Витьбичи. – 2019. – 14 марта. – С. VIII.*)

15 сакавіка адзначалася 25-годдзе прыняцця Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Урачыстае мерапрыемства было праведзена ў Віцебскай абласной філармоніі. Лепшым школьнікам Віцебшчыны старшыня аблвыканкама М. М. Шарстнёў уручыў пашпарты і кнігу

камерны жаночы хор Галіны Доўжык Наваполацкага Цэнтра культуры і аркестр народных інструментаў Наваполацкага музычнага каледжа.

Народны інструментальны ансамбль «Сустрэча» выкладчыкаў Лепельскай дзіцячай школы мастацтваў адзначыў 20-годдзе з дня стварэння калектыву на сцэне Лепельскага РДК. (*Лепельскі край. – 2019. – 8 лют. – С. 3.*)

У III адкрытым конкурсе маладых выканаўцаў на аркестравых інструментах імя М. К. Агінскага, які адбыўся **2–3 сакавіка** ў г. Маладзечна, высокія ўзнагароды заваявалі навучэнцы Віцебскага музычнага каледжа імя І. І. Салярцінскага. Уладальнікам Гран-пры ў намінацыі «Медныя духавыя інструменты» стаў Уладзімір Кавалёў.

22 сакавіка ў Браславе праходзіў фестываль баянна-акардэоннай музыкі «Баян FEST» з удзелам музыкантаў з Браслава, Пастаў, Мёр, Наваполацка і латвійскага Наўене. На сцэне РЦК выступілі салісты, дуэты, трыа, ансамблі. У праграме былі вылучаны музычныя блокі, прысвечаныя Году малой радзімы і 75-годдзю вызвалення Беларусі.

ХАРЭАГРАФІЯ

19–20 студзеня ў канцэртнай зале «Віцебск» адбыўся XXXIV Міжнародны конкурс па спартыўных бальных танцах «Витебская снежинка-2019», які сабраў лепшыя танцавальныя пары з 15 краін свету. Спаборніцтвы праводзіліся сярод розных узроставых катэгорый: дзеці, юніёры, моладзь, сеньёры. Танцавальныя пары выступалі ў еўрапейскай і лацінаамерыканскай праграмах. Арганізатарамі конкурсу выступілі Міністэрства спорту і турызму, Нацыянальны алімпійскі камітэт, Віцебскі аблвыканкам, Віцебскі гарвыканкам, Цэнтр культуры «Віцебск», Віцебская абласная федэрацыя спартыўнага танца і клуб спартыўнага танца «Фэст». (*Витебские вести. – 2019. – 22 янв. – С. 1, 5. ; Витьбичи. – 2019. – 22 янв. – С. 1–2.*)

Пастаноўка Віктара Клімчука. Сцэнограф Соф'я Шахноўская, харэограф Дзіяна Юрчанка. У галоўнай ролі Юрый Франкоў. У спектаклі занятыя акцёры Вольга Маханькова, Марына Марозава, Алег Рыхтэр, Сяргей Талкач, Вольга Лазебная, Наталля Гайдук.

27 сакавіка, у Міжнародны дзень тэатра, у тэатры імя Я. Коласа адбылася прэм'ера спектакля «Бальніца на краі свету» па п'есе сучаснага балгарскага драматурга Хрыста Бойчава. Пастаноўка, пераклад і музычнае афармленне мастацкага кіраўніка тэатра Міхася Краснабаева, мастак-пастаноўшчык – Святлана Макаранка. У спектаклі занятыя Аляксандр Базук, Генадзь Гайдук, Рыгор Шацько, Уладзімір Жураўлёў, Аляксей Стома, Яўген Бераснеў, Валянціна Багданава, Тамара Скварцова, Вячаслаў Грушоў і многія іншыя акцёры-коласаўцы.

Творча адзначылі Міжнародны дзень тэатра артысты «Лялькі». Яны падрыхтавалі мастацкую чытку дзвюх сучасных расійскіх п'ес: «Руская народная пошта» Алега Багаева і «Чалавек з Падольска» Дзмітрыя Данілава. Акцёр Сяргей Талкач выступіў у ролі чытальніка твора Г. Г. Маркеса «Вельмі стары чалавек з вялізнымі крыламі».

МУЗЫЧНАЕ ЖЫЦЦЁ

У 25-ы раз у Віцебску адбылося свята духоўнай музыкі, прымеркаванае да светлага Нараджэння Хрыстова. Яркая падзея **студзеня** зноў аб'яднала прыхільнікаў харавога мастацтва, ансамблевых спеваў. Звыш 300 дарослых і юных артыстаў выступілі на сцэне Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Я. Коласа. Да выканаўцаў з Віцебшчыны далучыліся творчыя калектывы з Масквы і Обнінска Маскоўскай вобласці, вакальна-харавы ансамбль «Мечта» з ДШМ імя І. С. Баха г. Балтыйска Калінінградскай вобласці. (*Витьбичи. – 2019. – 10 янв. – С. III.*)

Традыцыйны калядны канцэрт прымаў **7 студзеня** Сафійскі сабор Полацка. Канцэртную праграму сваімі талентамі ўпрыгожылі народны

«Я – грамадзянін Рэспублікі Беларусь». Святочны канцэрт падрыхтаваў Цэнтр культуры «Віцебск» з удзелам творчых калектываў ВНУ г. Віцебска.

Урачыстыя цырымоніі ўручэння пашпартоў і білетаў БРСМ у рамках Усебеларускай патрыятычнай акцыі «Мы – грамадзяне Беларусі!» праходзілі ва ўстановах культуры і адукацыі вобласці. Рэтраспектыўную выставу да юбілейнай даты арганізавалі супрацоўнікі Віцебскага абласнога краязнаўчага музея.

29 сакавіка на сцэне Віцебскай абласной філармоніі адбылося святкаванне 80-гадовага юбілею Віцебскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці. У юбілейным канцэрце выступілі звыш 20 заслужаных, народных і ўзорных калектываў вобласці, якія аб'ядналі на сцэне больш за 600 выканаўцаў. Адбылося ўшанаванне лепшых работнікаў. Вядучы метадыст АМЦНТ **Людміла Вакар** узнагароджана Ганаровым знакам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, дырэктар ВАМЦНТ **Кацярына Лабука** – Ганаровай граматай Міністэрства культуры, сама ўстанова – Ганаровай граматай Віцебскага аблвыканкама. Адзначаны і іншыя супрацоўнікі, якія зберагаюць і адраджаюць народнае мастацтва. Праз канцэртныя нумары былі прадстаўлены творчыя праекты Віцебскага АМЦНТ: «Кола беларускага календара», абласны турнір побытавых танцаў, конкурс духавой музыкі «Віват, аркестр!», Міжнародны фестываль барабаншчыц і мажарэтак, свята сярэднявечча «Меч Брачыслава», конкурс традыцыйнай свістулькі «Салавейка», нацыянальнае свята народнага традыцыйнага касцюма «Сцяжкі майстэрства», «Горад майстроў» у межах Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску», свята-конкурс тэатраў мод «Модны дывертысмент», агляд-конкурс харэаграфічных калектываў «Прыдзвінскія карункі», свята цыркавога мастацтва «Арэна» і інш. Святочную атмасферу на свяце стварылі: інструментальны ансамбль «Insound» Міёрскай ДШМ, тэатр гульні «Праяўленне» з Дубровенскага раённага цэнтра народнай творчасці і культурна-дасугавай дзейнасці, аматарскае аб'яднанне харэографаў Віцебскага раённага цэнтра культуры і творчасці. Таксама для ўдзельнікаў

і гасцей былі размешчаны стэнды з афішамі абласных святаў, фотаздымкамі супрацоўнікаў і ветэранаў установы.

КУЛЬТУРНЫЯ СУВЯЗІ

Падзеі Першай сусветнай вайны праз 100 гадоў сталі падставай для супрацоўніцтва Пастаўскага райвыканкама, раённага краязнаўчага музея і пасольства Францыі ў Рэспубліцы Беларусь. **У студзені** Пастаўшчына прымала Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Францыі ў Беларусі Дзідзье Канэса. У Парыжскім СДК і бібліятэцы еўрапейскаму дыпламату дапамаглі пранікнуцца самабытнай беларускай культурай вясёлыя найгрышы беларускіх мелодый, дэманстрацыя народных танцаў і знаёмства са старажытным абрадам калядавання. У райцэнтры пасол наведаў музей у палацы Тызенгаўзаў, дзе зацікавіўся экспазіцыяй, прысвечанай Першай сусветнай вайне і непасрэдна Нарацкай аперацыі. У ходзе візіту дыпламат выказаў намер аб далейшым супрацоўніцтве музеяў у Вердэне і Паставах, пашырэнні адносін у сферы культуры і адукацыі, развіцці ваенна-гістарычнага турызму. (*Витебские вести. – 2019. – 22 янв. – С. 2.*)

У студзені Глыбоччыну з сяброўскім візітам наведала дэлегацыя з польскага горада Равіч. Замежныя госці пазнаёміліся з дзейнасцю некаторых прадпрыемстваў, пабывалі ў Глыбоцкім гісторыка-этнаграфічным музеі, мастацкай школе імя Язэпа Драздовіча. Плануецца, што ў рамках наступнага «Вішнёвага фестывалю» адбудзецца падпісанне пагаднення аб супрацоўніцтве двух рэгіёнаў. (*Веснік Глыбоччыны. – 2019. – 26 студз. – С. 1–2.*)

Майстар Докшыцкага Дома рамёстваў Таццяна Марціновіч стала ўдзельніцай Дзён культуры Беларусі ў Аб'яднаных Арабскіх Эміратах, якія праходзілі **30 студзеня – 2 лютага** ў сталіцы краіны Абу-Дабі. Член Беларускага саюза майстроў народнай творчасці, метадыст Дома рамёстваў прадстаўляла свае вырабы з саломкі. (*Родныя вытокі. – 2019. – 16 лют. – С. 1.*)

Напрыканцы сакавіка Докшыцкі раённы Дом рамёстваў запрасіў наведвальнікаў на персанальную выставу твораў майстра-метадыста Наталлі Пятровіч, якая на працягу 20 гадоў займаецца адраджэннем народнага ткацтва Докшыччыны.

У сакавіку ў выставачнай зале Глыбоцкага Дома рамёстваў пачала экспанавацца выстава «Працяг традыцый». У экспазіцыі – тканыя пано і паясы, створаныя кіраўніком народнага клуба майстроў і мастакоў Браслаўшчыны «Ля возера» Наталляй Парахневіч.

ТЭАТРАЛЬНАЕ ЖЫЦЦЁ

Дыплом за адраджэнне і захаванне нацыянальнай традыцыйнай культуры атрымаў на XVII Міжнародным фестывалі традыцыйных тэатраў лялек «Калядная містэрыя» ў Санкт-Пецярбургу Беларускі тэатр «Лялька». Віцебскія лялечнікі прадставілі традыцыйную беларускую батлейку на роднай мове «Цар Ірад». У фестывалі, які традыцыйна праходзіць у пачатку **студзеня** ў Расійскім этнаграфічным музеі, удзельнічалі тэатры з Расіі, Беларусі і краін Балтыі. (*Витьбичи. – 2019. – 19 янв. – С. 5.*)

23 студзеня ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа (г. Мінск) у рамках музейнага праекта «Тэатр у музеі» адбыўся прагляд відэаверсіі спектакля «Сымон-музыка» ў выкананні акцёраў Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Я. Коласа. Пастаноўку ажыццявіў у 2018 годзе мастацкі кіраўнік тэатра Міхась Краснабаеў. У рамках мерапрыемства прайшла сустрэча з народнай артысткай Беларусі Таццянай Мархель, якая таксама выконвала ролі ў спектаклях па паэмах Я. Коласа «Сымон-музыка» і «Новая зямля» ў коласаўскім тэатры.

24 лютага ў Беларускім тэатры «Лялька» прайшоў «Барадулінскі Спеўны сход». Удзельнікі імпрэзы спявалі песні, якія любіў народны паэт Беларусі Рыгор Барадулін.

17 сакавіка ў Беларускім тэатры «Лялька» адбылася прэм'ера спектакля «Мастак. Вяртанне ў Віцебск», прысвечанага Марку Шагалу.

прафесіяналаў і аматараў, якія захапляюцца вырабам цацак і лялек з саломы, гліны, тэкстылю і іншых матэрыялаў.

Віцебскі раённы Цэнтр рамёстваў «Адраджэнне» **ў лютым** запрасіў наведвальнікаў на выставу льняных хустак-набіванак. Калекцыю галаўных убораў прадставіла майстар па тэкстылю гэтай установы культуры Дзіна Даўгяла.

На працягу **лютага** ў Чашніцкім раённым Доме рамёстваў экспанавалася выстава «Бабулін куфэрак», дзе былі прадстаўлены ручнікі, хусткі, посцілкі і розныя прылады быту нашых продкаў. Цэнтральныя экспанаты выставы – жаночы і мужчынскі касцюмы, рэканструяваныя майстрамі Аксанай Карабліной і Раісай Агель.

Майстры Расонскага раённага Дома рамёстваў прынялі ўдзел у выставе-кірмашы «Камора майстэрства» на Міжнародным фестывалі дэкаратыўна-прыкладной творчасці ў г. Себежы Пскоўскай вобласці. (*Голас Расоншчыны. – 2019. – 2 сак. – С. 4.*)

5 сакавіка ў ВАМЦНТ пачала працаваць выстава «Рэканструяваныя строі народнага адзення жыхароў Віцебскага павета ў пачатку XX стагоддзя» метадыста-майстра Віцебскага раённага цэнтра народных мастацкіх рамёстваў «Адраджэнне» Надзеі Гутнікавай. На выставе прадстаўлены некалькі калекцый мужчынскіх і жаночых строяў, адноўленых па вырабах-арыгіналах з фондаў Віцебскага абласнога краязнаўчага музея і краязнаўчага музея г. Вялікія Лукі (Расія). (*Краязнаўчая газета. – 2019. – № 10 (сак.). – С. 1.*)

Клуб аматараў вышыўкі «Волшебная нить», які працуе пры Цэнтры культуры «Віцебск», адкрыў **у сакавіку** выставу «Умелых рук творенье» ў Мастацкім музеі Віцебска.

5 сакавіка ў выставачнай зале ВАМЦНТ адкрылася абласная велікодная выстава «Светлы дзень». Майстры раённых Дамоў рамёстваў прадставілі ў экспазіцыі тыя вырабы, якімі славяцца іх рэгіёны. Цэнтральнае месца было адведзена велікодным яйкам.

14–15 сакавіка Глыбоччыну наведала дэлегацыя Інчукалнскага краю Латвійскай Рэспублікі. На сустрэчы гасцей з кіраўніцтвам раёна прысутнічаў консул Латвійскай Рэспублікі ў Віцебску Угіс Скуя, які падкрэсліў значнасць умацавання сяброўскіх сувязяў рэгіёнаў дзвюх краін. Вялася размова пра перспектывы эканамічнага і культурнага супрацоўніцтва. Прадстаўнікі дэлегацыі наведалі музей Паўла Сухога ў СШ № 1 райцэнтра, Глыбоцкі гісторыка-этнаграфічны музей, у якім дзейнічае зала віртуальных экскурсій, створаная дзякуючы мясцовай ініцыятыве «Стварэнне віртуальных падарожжаў па гісторыка-культурнай спадчыне рэгіёна». У якасці ганаровых гасцей яны прысутнічалі на мерапрыемстве, прысвечаным Дню Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, у зале ГДК.

27 сакавіка на сцэне Глыбоцкага ГДК выступіў Дзяржаўны драматычны прафесійны тэатр імя Важа Пшавела з г. Тэлаві (Грузія). Камедыю У. Шэкспіра «Дванаццатая ноч» на грузінскай мове гледачы ўбачылі дзякуючы падпісанаму ў 2018 годзе дагавору аб супрацоўніцтве паміж Глыбоцкім райвыканкамам і муніцыпалітэтам г. Тэлаві. Удзельнікі грузінскай дэлегацыі зрабілі аглядную экскурсію па райцэнтры, наведалі Глыбоцкі гісторыка-этнаграфічны музей і некаторыя прадпрыемствы.

Напрыканцы **сакавіка** дэлегацыя Глыбоцкага раёна пабывала ў польскім горадзе Равіч. Глыбачане пазнаёміліся з дзейнасцю мясцовых Дома культуры, музея і школы, дзе ў гэтыя дні праходзіў фестываль навук. На прыёме ў гарадскім упраўленні гміны былі акрэслены накірункі супрацоўніцтва ў сферы адукацыі, спорту і культуры. Польскі бок паабяцаў наведаць «Вішнёвы фестываль» у Глыбокім, у рамках якога плануецца падпісанне дагавора аб супрацоўніцтве.

У **сакавіку** г. Віцебск з афіцыйным візітам наведаў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Чэшскай Рэспублікі ў Беларусі Томаш Перніцкі. У ходзе візіту абмяркоўвалася пашырэнне супрацоўніцтва паміж Чэхіяй і Віцебскай вобласцю ў гандлёва-эканамічнай і культурнай сферах. Дыпламат наведаў Музей гісторыі Віцебскага народнага вучылішча, дзе

сустрэўся з юнымі віцебскімі мастакамі – пераможцамі Міжнароднай выставы мастацкіх твораў дзяцей «Лидице». Ён уручыў ім дыпломы, а Вікторыі Старыковіч вышэйшую ўзнагароду конкурсу – медаль «Лидицкая роза».

30 сакавіка ў Лёзненскім РЦК у рамках дэкады тэатральнай творчасці «На мяжы з думкай пра тэатр» адбыўся «Тэатральны weekend» пры ўдзеле аматарскіх творчых калектываў з гарадоў Ельня і Рудня Смаленскай вобласці. **31 сакавіка** лёзненскія паэты, удзельнікі літаратурнага аб'яднання «Пад абажурам», прымалі ўдзел у восьмым Міжнародным паэтычным конкурсе «Руднянские зори». Гэтыя творчыя праекты сталі традыцыйнымі для краін-суседзяў.

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНАЯ РАБОТА. САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ У СФЕРЫ ВОЛЬНАГА ЧАСУ

У Полацкім раённым Цэнтры культуры ў перадкалядныя дні па традыцыі былі падведзены вынікі дзейнасці культработнікаў раёна за 2018 год. Лепшыя СДК былі адзначаны заслужанымі ўзнагародамі. Ветэраны культуры і юбіляры атрымалі прэзенты ад прафсаюзнай арганізацыі. Музычныя падарункі адрасавалі прысутным творчыя калектывы «Тандем» і «X-Day». (*Полацкі веснік. – 2019. – 15 студз. – С. 4.*)

1 лютага ў Віцебскім абласным метадычным цэнтры народнай творчасці прайшоў Савет дырэктараў раённых устаноў культуры вобласці на тэму «Прыярытэтныя напрамкі дзейнасці арганізацый культуры ў 2019 годзе. Статыстыка і справаздачнасць за 2018 год». Дырэктары раённых Цэнтраў культуры, гарадскіх Дамоў культуры, Дамоў рамёстваў разгледзелі наступныя пытанні: рэалізацыя гуманітарных праектаў ва ўстановах культуры клубнага тыпу, планава-эканамічныя паказчыкі ўстановы, прыярытэтныя напрамкі дзейнасці ўстаноў культуры, арганізацыя работы калектываў мастацкай творчасці з найменнем

Напрыканцы **студзеня** ў Глыбоцкім Цэнтры традыцыйнай культуры і народнай творчасці адкрылася выстава «Кошык цудаў» – справаздачная выстава народнага клуба майстроў народных мастацкіх рамёстваў «Крыніца». (*Веснік Глыбоччыны. – 2019. – 2 лют. – С. 5.*)

Выстава майстроў Полацкага цэнтра рамёстваў і нацыянальных культур экспанавалася **ў лютым** у Культурна-гістарычным комплексе «Залатое кальцо горада Віцебска «Дзвіна». У экспазіцыі прадстаўлена 136 работ, выкананых 27 майстрамі з полацкіх клубаў «Роднасць» і «Майстар».

1 лютага ў Віцебскім абласным метадычным цэнтры народнай творчасці адбылася прэзентацыя выдання «Забава. Народная цацка і лялька Віцебшчыны». Укладальнік і аўтар тэксту – кандыдат мастацтвазнаўства, вядучы метадыст ДУ «Віцебскі АМЦНТ» Людміла Вакар. Да прэзентацыі была прымеркавана выстава работ майстроў, чыя творчасць прадстаўлена ў кнізе, і праведзены майстар-класы.

7–28 лютага ў выставачнай зале ВАМЦНТ экспанавалася выстава народных клубаў майстроў мастацкіх рамёстваў Верхнядзвінскага, Глыбоцкага, Пастаўскага і Міёрскага раёнаў **«Майстры Паазер'я».** Кожны клуб прадставіў справаздачную выставу на прадмет пацвярджэння наймення «народны». Экспанаваліся новыя творы майстроў мастацкіх рамёстваў клубаў за апошнія 3 гады.

8 лютага ў Пастаўскім Доме рамёстваў «Стары млын» адбыўся творчы вечар, прымеркаваны да 25-годдзя з дня заснавання народнага клуба майстроў народных мастацкіх рамёстваў і самадзейных мастакоў «Майстры». Была арганізавана выстава майстроў і рамеснікаў народнага клуба. Музычныя віншаванні падарылі ансамбль баяністаў «Вясёлка» ДШМ імя А. Тызенгаўза і гурт «Дзяўчаты» вакальнай эстраднай студыі «Славія» Цэнтра культуры і народнай творчасці раёна. (*Пастаўскі край. – 2019. – 13 лют. – С. 5.*)

15 лютага ў выставачнай зале КАЦ «Гарадок» адкрылася выстава «Гарадоцкая лялька», на якой былі прадэманстраваны работы майстроў-

«Рамеснік года Полаччыны-2018», які праведзены ўпершыню і сабраў 32 майстроў з Полацка і Наваполацка. Журы аднадушна прысудзіла Гран-пры Кацярыне Зяленскай за калекцыю керамічных свістулек «Рогатая рать» і «Птичье счастье».(*Полацкі веснік. – 2019. – 22 студз. –С. 4.* ; *Новополоцк сегодня. – 2019. – 11 янв. – С. 16.*)

У ВАМЦНТ праходзіла выстава-конкурс «Ой, праду, праду кудзеліцу…», дзе можна было пазнаёміцца з вырабамі традыцыйнага беларускага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, а таксама наведаць майстар-класы майстрых, якія адраджаюць старадаўнія рамёствы. У адкрыцці выставы прымаў удзел фальклорны гурт «Кудзеліца» Дубровенскага РДК. (*Витебские вести. – 2019. – 22 янв. – С. 7.*)

У Новалукомльскім Палацы культуры адбылося мерапрыемства, прысвечанае 80-гадоваму юбілею вядомага майстра дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Ганны Савельеўны Асіпковай – разьбяра па дрэве. На вечар-партрэт сабраліся кіраўнікі раёна, устаноў культуры і адукацыі, многія прыхільнікі творчасці майстра. Прысутныя пазнаёміліся з выставай работ юбіляра пад назвай «Я хочу вам подарить свою любовь». Гучалі шчырыя віншаванні і душэўныя песні ў выкананні хору ветэранаў Новалукомльскага Палаца культуры. (*Чырвоны прамень. – 2019. –* 22студз. *– С. 5.*)

28 студзеня ў Шаркаўшчынскім раённым Цэнтры рамёстваў адкрылася выстава работ майстроў народнай творчасці раённага Цэнтра рамёстваў і Германавіцкага Дома ганчара.

У Глыбоцкім раённым Доме рамёстваў **у студзені** адкрылася выстава «Набываючы майстэрства». Аўтар – метадыст «па беларускай ляльцы» Таццяна Фаміна, якая займаецца рознымі відамі рукадзелля і паказала іх у экспазіцыі.

Аўтарская лялька была прадстаўлена і на выставе «Мары і казкі» ў Браслаўскім музеі традыцыйнай культуры. У экспазіцыі больш за паўсотні работ майстра Марыны Дворскай.

«народны» і «ўзорны», арганізацыя выставачнай дзейнасці Дамоў (Цэнтраў) рамёстваў і г. д.

10 лютага ў Бягомлі стартаваў праект «З вялікай любоўю да малой радзімы». Распачалося свята з адкрыцця ў Бягомльскім музеі народнай славы арт-кафэ «Кветкі». У ГДК была разгорнута выстава «Бягомльшчына працавітая і таленавітая», на якой побач з вырабамі майстроў дэкаратыўна-прыкладной творчасці была прадстаўлена творчасць літаратараў Бягомльшчыны на кніжнай выставе «Старонка мая, я часцінка твая…». Канцэртную праграму склалі выступленні выканаўцаў і творчых калектываў Докшыцкага раёна.

Сацыяльна-культурны праект «Творческое долголетие» пачаў ажыццяўляцца работнікамі Віцебскага раённага цэнтра культуры і творчасці. У рамках праекта прадугледжана наведванне адзінокіх пажылых грамадзян раёна, правядзенне розных мерапрыемстваў і акцый. Творчая група на чале з намеснікам дырэктара ВРЦКТ Марынай Яско пабывала ў в. Андронавічы і прынесла шмат станоўчых эмоцый яе жыхарам.

Напрыканцы **лютага** Расонскі музеі баявой садружнасці прымаў семінар-нараду кіраўнікоў устаноў культуры раёна і адказных за арганізацыю ідэалагічнай работы ў працоўных калектывах. Былі падведзены вынікі працы за 2018 год і вызначаны задачы на 2019 год, прайшло ўзнагароджанне лепшых устаноў культуры, творчых калектываў і культработнікаў.

28 лютага – 1 сакавіка ў Оршы прайшлі мерапрыемствы рэспубліканскага свята «Маладзёжная сталіца Рэспублікі Беларусь-2019». Яркую канцэртную праграму ў Лядовай арэне прапанавалі гледачам аршанскія артысты.

«Мелодыі роднага краю» – пад такой назвай у **сярэдзіне сакавіка** адбылася імпрэза ў Пастаўскім Доме рамёстваў «Стары млын», прысвечаная Году малой радзімы. У рамках мерапрыемства адкрылася выстава работ самадзейных мастакоў Яніны Ліманоўскай і Віктара Пісарчыка, выступілі паэт Ігар Пракаповіч і кампазітар Людміла Логінава.

КЛУБНАЯ СПРАВА

У навагоднія дні ў Экіманскім сельсавеце Полацкага раёна працавала «Гасцёўня Дзеда Мароза на калёсах». Работнікі аўтаклуба Полацкага раённага Цэнтра культуры сумесна з артыстамі Багатырскага СДК правялі святочныя сустрэчы з жыхарамі сельсавета і работнікамі працоўных калектываў. Для мнагадзетных сем'яў і сем'яў з дзецьмі-інвалідамі было арганізавана свята «Чудо Рождества».

У Мазалаўскім СДК Віцебскага раёна адбылася прэм'ера спектакля «Марозка» па матывах аднайменнай рускай казкі, падрыхтаванага творчымі калектывамі Дома культуры і Мазалаўскай ДШМ. (*Жыццё Прыдзвіння. – 2019. – 12 студз. – С. 8.*).

13 студзеня ў в. Азіна Полацкага раёна адбыліся здымкі народнага абрада «Хрэсьбіны» ў рамках праекта «Полацк. Дзе пачынаецца краіна» тэлеканала «Беларусь-4». Удзельнікі народнага вакальнага ансамбля «Бела чайка» (кіраўнік В. Малых) Азінскага СДК на працягу 5 гадоў вельмі неардынарна ладзяць гэты сямейна-бытавы абрад, абапіраючыся на звычаі сваёй мясцовасці.

18 студзеня ў Наваполацкім Цэнтры рамёстваў і традыцыйнай культуры прайшла тэматычная вечарына «З кім век векаваць» з удзелам народнага гурта архаічных спеваў «Княжыч».

25 студзеня ў Лёзненскім раённым Цэнтры культуры адбыўся традыцыйны гала-канцэрт народных калектываў «Скарбонку творчасці Радзіме прысвячаем».

З праграмай «Поет душа», прымеркаванай да Года малой радзімы і 100-годдзя ўтварэння БССР, народны клуб «Ветэран» Расонскага Цэнтра культуры і народнай творчасці пабываў у многіх населеных пунктах раёна.

30 студзеня ў Полацкім раённым Цэнтры культуры была праведзена тэматычная праграма «Будзьце верныя сваім караням…», прысвечаная Году малой радзімы і 100-годдзю заснавання БССР. Галоўнымі героямі мерапрыемства сталі работнікі клубных устаноў культуры Полацкага раёна і супрацоўнікі Цэнтра.

міфалогіі) прапанавалі ўвазе наведвальнікаў беларускі графік Валерый Славук і скульптар Антон Шпіца.

У Віцебску **ў студзені** адкрыліся дзве выставы замежных аўтараў. У адкрыцці выставы работ польскага мастака Аляксандра Штурмана ў Мастацкім музеі прыняў удзел пасол Польшчы ў Беларусі Артур Міхальскі. Консул Латвійскай Рэспублікі ў Віцебску Угіс Скуя ўдзельнічаў у адкрыцці выставы «Сакральная абстракцыя» рыжскай мастачкі Анцэ Грыцмане ў Арт-цэнтры Марка Шагала.

У лютым у Лепельскім краязнаўчым музеі працавала выстава «Мая Беларусь», прысвечаная Году малой радзімы. У экспазіцыі прадстаўлены жывапісныя творы з калекцыі Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь аўтарства вядомых мастакоў Юрыя Гаўрына, Валянціна Савіцкага, Віталя Цвіркі, Леаніда Дударэнкі, Анатоля Бараноўскага, Уладзіміра Пракапцова.

У **сакавіку** творы сучасных прадстаўнікоў Віцебскай мастацкай школы экспанаваліся ў I – Gallery. Intelligence (г. Парыж). Жыхары і госці французскай сталіцы пазнаёміліся з жывапіснымі работамі Алега Скаародкі, Мікалая Дундзіна, Віктара Шылко, Алега Захарэвіча і Алега Крошкіна.

«…и мёд я пил…» – выставачны праект пад такой назвай прадставіў віцебскі мастак-канцэптуаліст Васіль Васільеў у Мастацкім музеі Віцебска. Аўтар прысвяціў выставу 50-годдзю сваёй творчай дзейнасці.

На X Міжнароднай выставе «Калегіум», якая экспанавалася **ў сакавіку** ў Аршанскай гарадской мастацкай галерэі В. Грамыкі, было прадстаўлена 150 работ мастакоў з Беларусі, Расіі, Арменіі, Малдовы, Балгарыі.

ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНОЕ МАСТАЦТВА

У Полацкім раённым Цэнтры рамёстваў і нацыянальных культур **у студзені** прайшоў адкрыты раённы конкурс народных майстроў і мастакоў

22 сакавіка свой пяцідзясяты дзень нараджэння на сцэне раённага Цэнтра культуры адзначыла Расонская дзіцячая школа мастацтваў. Юбілейнай даце быў прысвечаны святочны канцэрт пад назвай «Чароўны свет мастацтва».

ВЫЯЎЛЕНЧАЕ МАСТАЦТВА

16 студзеня ў Гарадоцкім краязнаўчым музеі адкрылася персанальная выстава твораў віцебскай мастачкі Ірыны Барсуковай. У экспазіцыі пад назвай «Мая Беларусь» – 28 работ, выкананых у тэхніках графікі, жывапісу, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

У Лепельскім цэнтры рамёстваў **у студзені** экспанавалася выстава «Лепельскія пейзажы». Мастакі з Мінска, Віцебска, Гомеля, Лепеля і Санкт-Пецярбурга, якія прымалі ўдзел у пленэры па жывапісных мясцінах Лепельшчыны, прысвяцілі свае творы Году малой радзімы.

Выстава жывапісу «Обаяние пейзажа» працавала **ў студзені** ў Лепельскім раённым краязнаўчым музеі. Аўтар – вядомы віцебскі мастак Анатоль Ільіноў, член Беларускага саюза мастакоў з 1972 года.

У студзені ў Арт-цэнтры Марка Шагала экспанавалася выстава фарфоравых скульптур расійскай мастачкі Галіны Дулькінай.

У Мастацкім музеі Віцебска **ў студзені** адкрылася выстава твораў віцебскага мастака Сяргея Кухто (1959–1999), прысвечаная 60-годдзю з дня нараджэння майстра, які сваю творчасць прысвяціў міфічным стварэнням – кентаўрам.

На працягу **студзеня** ў выставачнай зале Музея гісторыі і культуры горада Наваполацка была прадстаўлена выстава «Сузор'е прыдзвінскіх мастакоў» з фондаў музея. Сярод аўтараў – мэтры беларускага мастацтва Іван Сталяроў, Нінэль Шчасная, Людміла Шчамялёва, Алесь Марачкін, а таксама вядомыя наваполацкія жывапісцы Пётр Грывусевіч, Віктар Лук'янаў, Георгій Танковіч, Яўгеній Панамарэнка. Унікальную выставу да Года малой радзімы «Старыя героі – новы свет» (героі беларускай

7 лютага ў Дубровенскім РДК адбыўся юбілейны канцэрт «20 лет поем вместе» народнага хору ветэранаў «Надежда».

Узорны тэатр моды «Топ-топ» Цэнтра культуры г. Наваполацка заваяваў Гран-пры I Рэспубліканскага конкурсу мастацтваў «Шлях да мары» ў г. Мінску. (*Новополоцк сегодня. – 2019. – 15 февр. – С. 16.*)

Ва Ушацкім РДК была арганізавана творчая сустрэча «Я з ушацкай зямлі», прысвечаная 20-годдзю літаратурнай дзейнасці самадзейнай паэтэсы Валерыі Міхно з в. Лутава Сяльцо.

Новы праект, прысвечаны Году малой радзімы, рэалізуе Полацкі раённы цэнтр культуры. У межах «Цікавага падарожжа Надзейкі» работнікі культуры ажыццяўляюць цыклічны праект «Малая радзіма пачынаецца з сям'і». Першае падарожжа здзейснена ў аграгарадок Палата.

У гонар свята **8 сакавіка** ў Шаркаўшчынскім раённым Цэнтры культуры быў арганізаваны святочны канцэрт «Когда поют мужчины».

9 сакавіка работнікі Бароўскага Цэнтра культуры і адпачынку Лепельскага раёна правялі свята «Эх, Масленица, да широкая!», на якое запрасілі калег з раённага Дома культуры. Была арганізавана вялікая выстава дэкаратыўна-прыкладной творчасці. У канцэртнай праграме ўдзельнічалі вакальны калектыў «Околица», гурток «Тэатр мініяцюр», вакальная група «Сударушка», артысты РДК, дзеці з аздараўленчага цэнтра «Жемчужина».

У пачатку **сакавіка** акцёры народнага тэатра Міёрскага РДК парадавалі гледачоў прэм'ерай пастановак «Скучающий аноним» і «Загадочный мужчина» па творах расійскіх драматургаў Віктара Ляпіна і Алега Ярнёва.

22 сакавіка калектыў Заронаўскага СДК правёў народнае свята «На Саракі пайшоў снег да ракі», якое сімвалізуе дзень вясновага раўнадзенства, сустрэчу вясны.

Народны драматычны тэатр «Пошук» Лепельскага раённага Дома культуры адсвяткаваў Міжнародны дзень тэатра прэм'ерай спектакля па матывах В. Шукшына «А поутру они проснулись…». Рэжысёр-

пастаноўшчык – кіраўнік тэатра Віктар Джамілашвілі. Прэм'ера адбылася **27 сакавіка** на сцэне РДК.

27 сакавіка ў Докшыцкай кінаканцэртнай зале «Іскра» адбылася прэм'ера спектакля па п'есе «Тапачкі з чэкам» Т. Камылінай у пастаноўцы самадзейных артыстаў Параф'янаўскага СДК. Яна была прысвечана памяці **Ганны Васільеўны Яцкоўскай** – стваральніка і нязменнага кіраўніка Докшыцкага народнага тэатра на працягу 35 гадоў.

Удзельнікі клуба культурна-гістарычнай рэканструкцыі «Паўночная вежа» Культурна-гістарычнага комплексу «Залатое кальцо горада Віцебска "Дзвіна"» **ў сакавіку** арганізавалі шляхецкі баль у Палацы дзяцей і моладзі г. Наваполацка.

Святочны вечар у рамках раённага культурнага праекта «З вялікай любоўю да малой радзімы» адбыўся **ў сакавіку** ў Параф'янаўскім СДК Докшыцкага раёна.

У Башнёўскім сельскім клубе Шумілінскага раёна прайшоў вечар-партрэт «Россыпы не дарэмна пражытых гадоў», прысвечаны былому старшыні калгаса імя Энгельса Леаніду Пагарэльскаму. Вечар адкрыў новы праект работнікаў культуры «Мая малая радзіма».

ФЕСТЫВАЛІ, СВЯТЫ, КОНКУРСЫ

7 студзеня па ўсёй вобласці праходзілі святочныя мерапрыемствы, прысвечаныя праваслаўнаму святу Нараджэння Хрыстова. Вялікі святочны канцэрт з удзелам лепшых творчых калектываў і выканаўцаў з Полацка, Наваполацка і Глыбокага адбыўся ў Сафійскім саборы. У Цэнтры культуры «Полацк» былі праведзены «Рождественские встречи», у рамках якіх прайшло ўшанаванне пераможцаў адкрытага конкурсу праваслаўнай літаратурна-музычнай творчасці «Благовест над Полоцком». «Рождественский бал» быў арганізаваны ў канцэртнай зале «Віцебск». Традыцыйна на праваслаўнае Ражаство ў Культурна-гістарычным комплексе «Залатое кальцо горада Віцебска "Дзвіна"» адбыліся «Віцебскія

Мерапрыемствы, прысвечаныя 100-гадоваму юбілею Полацкай дзіцячай школы мастацтваў, пачаліся **29 студзеня** вялікім фартэпіянным канцэртам выхаванцаў і педагогаў школы ў канцэртнай зале Сафійскага сабора.

Выхаванка ДШМ № 1 г. Наваполацка Соф'я Палякевіч заваявала дыплом лаўрэата I ступені на XXIV Міжнародным конкурсе маладых піяністаў, які праходзіў **30 студзеня** ў латвійскім горадзе Валміера.

2 лютага навучэнцы Расонскай ДШМ прынялі ўдзел у конкурсе-фестывалі «Я музыкантом стать хочу» ў расійскім горадзе Пскове. Яны прывезлі на радзіму граматы, а іх педагогі – падзякі за прафесіяналізм.

Выхаванцы Наваполацкай дзіцячай мастацкай школы № 1 **у лютым** удзельнічалі ў XI Міжнародным конкурсе юных піяністаў, прысвечаным знакамітай рускай піяністцы Марыі Юдзінай, у г. Невелі Пскоўскай вобласці і вярнуліся з дыпломамі лаўрэатаў II і III ступеняў.

Юныя музыканты Браслаўскай ДШМ Ева Петушко і Мікіта Рэдзько прымалі ўдзел у III Міжнародным конкурсе маладых выканаўцаў на духавых інструментах «Naujene Wind 2019», які праходзіў **28 лютага – 1 сакавіка** ў латвійскім горадзе Даўгаўпілсе. Яны сталі лаўрэатамі II і III ступені, а іх вопытны педагог Славамір Цітовіч быў членам журы конкурсу.

1–3 сакавіка навучэнцы дзіцячых школ мастацтваў № 2 і № 3 г. Оршы прынялі ўдзел у фестывалі-конкурсе выканаўцаў сола на ўдарнай устаноўцы «TRUMMAANIA-2019» у г. Сілламяэ (Эстонія). У сваёй узроставай групе яны заваявалі прызавыя месцы. Настаўнік ДШМ № 3 Антон Жалязнякоў заняў II месца і атрымаў прыз глядацкіх сімпатый.

Нацыянальны адбор на вакальныя конкурсы XXVIII Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» быў праведзены **16 сакавіка** ў ГЦК «Победа» г. Оршы.

Матэрыяльную базу школ мастацтваў і ўстаноў культуры Аршанскага рэгіёна папоўнілі 15 новых фартэпіяна. Міністр культуры Ю. П. Бондар перадаў установам музычныя інструменты і сустрэўся з педагогамі і выхаванцамі ДШМ № 1 г. Оршы.

26 сакавіка на сесіі Пастаўскага раённага Савета дэпутатаў разглядалася пытанне «Аб мерапрыемствах па захаванні і прымнажэнні гісторыка-культурнай спадчыны ў рамках Года малой радзімы».

МАСТАЦТВА

3–8 студзеня юныя піяністы ДШМ № 1 г. Наваполацка ўдзельнічалі ў X Міжнародным конкурсе імя С. І. Саўшынскага, які праходзіў у Інстытуце музыкі, тэатра і харэаграфіі РДПУ імя А. І. Герцэна (г. Санкт-Пецярбург). У конкурсе ўдзельнічалі звыш 150 канкурсантаў з Расіі, Кітая, Аўстрыі, Літвы, Латвіі, Беларусі. Дар'я Ізмайловіч стала лаўрэатам II прэміі ў намінацыі «Сола», Дарый Абрамовіч – лаўрэат III ступені і ўладальнік дыплома ў намінацыі «Юны канцэртмайстар».

У Браслаўскай ДШМ быў праведзены адкрыты раённы конкурс «К солнцу», які сабраў 80 удзельнікаў – музыкантаў і спевакоў са школ мастацтваў Браслаўшчыны, Мёр, Глыбокага, Докшыц, Нарачы, Пастаў, Даўгаўпілскага вучылішча імя С. Брока, Шпогскай і Наўенскай музычных школ Даўгаўпілскага краю (Латвія). Юная цымбалістка Люба Няборская з Браслаўскай ДШМ заваявала Гран-пры конкурсу. (*Браслаўская звязда. – 2019. – 12 студз. – С. 5.*)

Традыцыйная выстава-конкурс дзіцячай творчасці «Калядныя матывы» была размешчана ў выставачных залах ДШМ № 3 Віцебска «Маладзік». Звыш 400 юных мастакоў з розных куткоў Віцебшчыны прадставілі свае работы ў экспазіцыі (жывапіс, графіка, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва). (*Витебские вести. – 2019. – 15 янв. – С. 8.*)

У Культурна-гістарычным комплексе «Залатое кальцо горада Віцебска «Дзвіна» экспанавалася выстава дзіцячай творчасці «Сказки Рождества» юных майстроў і мастакоў з гімназій і школ абласнога цэнтра. У экспазіцыі – звыш 300 экспанатаў (жывапіс, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва).

Каляды, або Каляды ў Задзвінні». Вялікі дабрачынны канцэрт «Калядныя ўзоры» арт-групы «Вдохновение» і ўзорнага ансамбля танца «Веселушки» ў гарадскім Цэнтры культуры «Победа» стаў сапраўдным падарункам аршанцам.

12 студзеня аматары старажытных традыцый танцавальнай, песеннай, музычнай культуры сустрэліся на раённым фальклорным свяце «Скача хата, калі свята» ў Бычыхінскім СДК Гарадоцкага раёна. Арганізатар – Цэнтр традыцыйнай культуры і народнай творчасці. Акрамя мясцовых фальклорных калектываў на сцэне Дома культуры з поспехам выступіў фальклорны ансамбль «Горница» з Санкт-Пецярбурга. Расійскія госці прадэманстравалі батлеечны спектакль «Царь Ирод».

13 студзеня ў в. Багатырская Полацкага раёна быў праведзены арт-уікэнд «Калядны разгуляй» у рамках рэалізацыі тэматычнага праекта, прысвечанага аднаўленню і папулярызацыі старажытных беларускіх абрадаў і звычаяў. Арганізатар – Полацкі раённы Цэнтр культуры. На свята з'ехаліся 10 гуртоў з розных куткоў Полаччыны, каб паспаборнічаць у майстэрстве калядавання. Калядную праграму, максімальна набліжаную да аўтэнтычнага абраду, паказаў фальклорны гурт «Варган» Полацкага дзяржуніверсітэта. У творчым рынгу «Дзівосы на Каляды» кожная каманда прадэманстравала свае крэатыўныя знаходкі. (*Витебские вести. – 2019. – 19 янв. – С. 16.*)

Святочнае прадстаўленне «Калядкі – вясёлыя святкі» арганізавалі работнікі Чашніцкага ГДК у калядны вечар на галоўнай плошчы райцэнтра. Тэатралізаванае свята ладзілі і дзеці, і дарослыя. Дзіцячы фальклорны калектыў «Вербачка» прапанаваў гледачам абрад «Гэй, Каляда!». Добры настрой дарылі ўдзельнікі народнага клуба «Ветэран» і творчыя калектывы: народны тэатр мініяцюр «Каласок», народны ансамбль народнай песні «Ульчанка», вакальныя групы «Рябинушка» і «Девчата».

14 студзеня Сенненскі раённы Цэнтр культуры і народнай творчасці па традыцыі завяршыў калядныя і навагоднія святы вялікім канцэртам, у якім прынялі ўдзел выхаванцы і педагогі дзіцячых школ

мастацтваў Сенненшчыны, акцёры тэатра батлейкі раённага Дома рамёстваў. Майстры дэкаратыўна-прыкладной творчасці прапанавалі калядныя сувеніры, удзельнікі народнага клуба нацыянальнай кухні, гульні і фальклору «Хадчаначка» Ходцаўскага СДК – дэгустацыю калядных страў.

Калядны фестываль «Падарунак з нябёсаў» быў праведзены **15 студзеня** ў Верхнядзвінскім раённым Цэнтры культуры і народнай творчасці ў восьмы раз. Увазе прысутных былі прапанаваны тэматычныя выставы мастацкай і духоўнай літаратуры, народнай і дзіцячай творчасці. Фестываль упрыгожыў канцэрт, падрыхтаваны педагогамі і навучэнцамі Верхнядзвінскай ДШМ. У свяце прынялі ўдзел святары трох хрысціянскіх канфесій: настаяцель храма Святога Мікалая Цудатворца В. Вабішчэвіч, пробашч касцёла Нараджэння Панны Марыі А. Грыцкевіч і епіскап Аб'яднання цэркваў хрысціян Веры Евангельскай ў Віцебскай вобласці П. Чынікайла.

Раённы «Калядны FEST» у чацвёрты раз прайшоў на Дубровеншчыне. У аграгарадок Дабрынь з'ехаліся работнікі ўстаноў культуры рэгіёна, каб прадэманстраваць прафесійнае майстэрства, веданне традыцый і абрадаў, прымерыць на сябе вобразы шчадроўшчыкаў і падарыць усім свята. У праграме: народныя гульні, карагоды, ваджэнне каляднага кола, прэзентацыя калядных страў, калядныя пасядзелкі з гульнямі і гаданнем.

19 студзеня ў Полацкім гарадскім Палацы культуры прайшоў першы адкрыты рок-фэст пад назвай «Rock Wave» з удзелам калектываў з Мінска, Наваполацка, Віцебска і Полацка.

Занальныя адборачныя туры абласнога конкурсу патрыятычнай песні «Песні юнацтва нашых бацькоў», прысвечанага Году малой радзімы, прайшлі **13 лютага** ў Гарадку і **15 лютага** ў Верхнядзвінску.

15 сакавіка ў Палатоўскім СДК Полацкага раёна ладзіліся вячоркі «Тёщины сборы по-полотовски», у якіх удзельнічалі прадстаўнікі 11 сельскіх населеных пунктаў раёна. У праграме: конкурс «Цешчына стажыроўка», блінны забег «Цешчына спакуса», прыпевачная бітва «Ох ты,

Акцябрскай СШ музейна-педагагічныя заняткі «Дзень мужнасці і патрыятызму».

Выставачны праект «Вайна і каханне», прысвечаны 75-годдзю вызвалення Беларусі, рэалізуе Полацкі краязнаўчы музей сумесна з гістарычнай майстэрняй імя Леаніда Левіна (г. Мінск). На працягу **сакавіка** супрацоўнікі музея ў рамках выставы праводзілі лекцыі, семінары, сустрэчы з гісторыкамі.

Сваё 15-годдзе адзначыў Віцебскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей – адзін з самых крэатыўных і маладых у вобласці. (*Витебские вести. – 2019. – 2 марта. – С. 11.*)

24 лютага ў Браслаўскім музеі традыцыйнай культуры адкрылася выстава фотаздымкаў з унікальнага архіва шкляных негатываў пачатку XX стагоддзя. Аўтарам фотаздымкаў з'яўляецца праваслаўны святар Павел Валынцэвіч (1875–1962). На 82 фатаграфіях прадстаўлена падрабязная хроніка паўсядзённага жыцця мястэчка Узмёны Міёрскага раёна (да 1939 года – Браслаўскі павет) і наваколля на працягу паўстагоддзя. Фотаспадчына П. Валанцэвіча захавалася дзякуючы калекцыянеру Дзмітрыю Сярэбранікаву, мастаку-рэстаўратару Ігару Сурмачэўскаму і фатографу Уладзіміру Суцягіну.

У Музеі гісторыі і культуры Наваполацка стартаваў новы культурна-адукацыйны праект «Творчы саюз». Яго першымі героямі сталі вядомыя наваполацкія харэографы, кіраўнікі дзіцячай студыі «Калібры» Палаца культуры ААТ «Нафтан» Міхаіл і Валянціна Асадчыя. У **сакавіку** музейная ўстанова прадставіла наведвальнікам унікальную выставу паштовых марак «Гісторыя і сучаснасць у марках назалежнай Беларусі» з асабістай калекцыі наваполацкага філатэліста Эдуарда Свірыдзенка.

20 сакавіка ў Лёзненскім ваенна-гістарычным музеі адкрылася выстава «Под небом мастера». У экспазіцыі – работы з калекцыі УК «Музей Марка Шагала ў Віцебску». Іх аўтары – міжнародная група мастакоў-жывапісцаў, якія прымалі ўдзел у IV Шагалаўскім пленэры летам 2018 года.

13 лютага ў Мемарыяльнай зале Расонскага музея баявой садружнасці прэзентацыяй фотавыставы «Памятныя сустрэчы з Пятром Міронавічам Машэравым на Расоншчыне» адкрыўся Тыдзень памяці выдатнага беларускага дзеяча.

14 лютага ў г. п. Баравуха Полацкага раёна, які вядомы сваім баявым мінулым, урачыста адкрылася стацыянарная экспазіцыя «Гісторыя воінскай славы Баравухі». Першы запіс у Кнізе ганаровых гасцей новага культурна-гістарычнага аб'екта Баравухі зрабіў старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў У. Цярэнцьеў.

15 лютага адзначаўся Дзень памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў і 30-годдзе вываду савецкіх войск з Афганістана. Па ўсёй вобласці прайшлі мітынгі-рэквіемы, прысвечаныя памяці загінуўшых у афганскай вайне. У вобласці адбыліся ўрачыстыя цырымоніі з нагоды адкрыцця мемарыяльных дошак загінуўшым воінам-інтэрнацыяналістам: у гонар лётчыка Сяргея Спелава на фасадзе СШ № 30 г. Віцебска, у гонар выпускніка віцебскай СШ № 4 Сяргея Кароткіна на будынку школы, у гонар выпускніка СШ № 2 г. Чашнікі (зараз Чашніцкая гімназія) Сцяпана Млявага на будынку ўстановы адукацыі.

У музеі гісторыі і культуры г. Оршы працавала выстава «Время выбрало нас», арганізаваная сумесна з раённай арганізацыяй ГА «Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане».

У Лепельскім раённым краязнаўчым музеі прайшоў вечар памяці «Апаленыя вайной», на які былі запрошаны ўдзельнікі афганскай вайны і навучэнцы гімназіі імя І. М. Ерашова.

Напярэдадні Дня абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь у Віцебскім абласным музеі Героя Савецкага Саюза М. П. Шмырова праводзіўся цыкл заняткаў «Оружейные истории». Да свята была прымеркавана выстава мужчынскіх гальштукаў з прыватнай калекцыі Уладзіміра Удаеўскага.

У рамках Дня юнага героя-антыфашыста супрацоўнікі Віцебскага раённага гісторыка-краязнаўчага музея арганізавалі для піянераў

мой зяцёк», этнаскокі «Цешча і зяць ідуць танцаваць» і інш. Арганізатары свята – работнікі раённага Цэнтра культуры.

Пятае абласное свята батлеечных пастановак і тэатраў лялек «Лялечны свет», праведзенае **22 сакавіка** ў Сенненскім раённым Цэнтры культуры і народнай творчасці, сабрала 15 творчых калектываў. Майстар-клас для артыстаў-батлеечнікаў правёў кіраўнік народнага тэатра лялек «КапялюШ» Цэнтра рамёстваў і традыцыйнай культуры ДУК «Цэнтр культуры г. Наваполацка» Андрэй Рэцікаў. Была арганізавана традыцыйная дабрачынная акцыя «Творчыя калектывы – дзецям». Гран-пры прысуджаны лялечнаму тэатру «Тарасавы байкі» Дома рамёстваў і фальклору ДУК «Цэнтр традыцыйнай культуры і народнай творчасці Гарадоцкага раёна». Пераможца ў намінацыі «лялечны спектакль» – узорны лялечны тэатр «Батлейка» ДУК «Шумілінскі Дом рамёстваў», у намінацыі «традыцыйны беларускі тэатр «батлейка» – творчы калектыў раённага Цэнтра рамёстваў ДУК «Шаркаўшчынскі РЦК».

XXV Міжнародны фестываль «Пурымшпіль у Віцебску» сабраў прадстаўнікоў Беларусі, Ізраіля, Расіі, Украіны, Расіі, ЗША, Германіі, Латвіі і іншых краін. Форум, які служыць аб'яднанню яўрэйскай моладзі на аснове нацыянальных традыцый, прайшоў **29–31 сакавіка** на сцэне Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Я. Коласа.

БІБЛІЯТЭЧНАЯ СПРАВА

Намеснік дырэктара па бібліятэчнай рабоце Віцебскай абласной бібліятэкі **Вольга Макараўна Камендантава** ўзнагароджана Граматай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь за шматгадовую добрасумленную працу і значны ўклад у папулярызацыю нацыянальнай культуры.

ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна»

2 студзеня прайшла ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання пераможцаў і прызёраў Еўразійскага бібліятэчнага Інтэрнэт-форуму

«Футбол – спорт, мастацтва, творчасць» у рамках міжнароднага праекта «Дыялог нацыянальных літаратур». Пераможца міжнароднага этапу ў намінацыі «Бібліятэкар» – Інга Сарока, загадчык электроннай чытальнай залы Віцебскай абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна, аўтар электроннай кніжна-ілюстрацыйнай выставы «Паэзія футбола». Прызёрам міжнароднага этапу ў намінацыі «Малады чытач» стаў Аляксей Глазман, чытач Віцебскай абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна – аўтар буктрэйлера «И все-таки футбол».

3 студзеня ў аддзеле літаратуры па мастацтве адбылося адкрыццё выставы аўтарскіх лялек Анастасіі Марозавай «Героі казак».

У рамках міні-праекта «90 гадоў у коле сяброў...», прымеркаванага да 90-годдзя Віцебскай абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна, у сектары замежнай літаратуры з **канца снежня 2018 г. па 10 студзеня 2019 г**. праходзілі цыклы гучных чытанняў замежнай літаратуры «Чытаем разам».

10 студзеня ў рамках штогадовай дабрачыннай акцыі «Подари радость чтения» супрацоўнікамі аддзела абанемента і МБА было перададзена ў бібліятэку ўстановы «ЛПП № 4» УДВП МУС па Віцебскай вобласці больш за 300 выданняў.

10 студзеня ў аддзеле дзіцячай літаратуры адбылося тэатралізаванае адкрыццё выставы дзіцячай творчасці, прымеркаванай да 220-гадовага юбілею А. С. Пушкіна «У кожнага свой Пушкін», на якой прадстаўлены работы навучэнцаў 4 «Г» класа гімназіі № 1 г. Віцебска.

10 студзеня адбылося адкрыццё выставы члена праўлення Віцебскага абласнога аддзялення ГА «Беларускі саюз мастакоў» Кацярыны Мясніковай «Solitude».

14 студзеня ў аддзеле эканамічнай, тэхнічнай і сельскагаспадарчай літаратуры прайшла сустрэча з агароднікам-аматарам Надзеяй Іванаўнай Куц «Мой сакрэт смачных таматаў».

15 студзеня ў аддзеле літаратуры па мастацтве адбылася сустрэча з віцебскім кампазітарам Аляксандрам Івановым, выкладчыкам дзіцячай школы мастацтваў № 4 г. Віцебска.

праведзеная **ў студзені** ў Музеі гісторыі і культуры Наваполацка. У межах канферэнцыі прайшла прэзентацыя новых выданняў установы – каталога «Мастакі Наваполацка» і набора паштовак «Помнікі і скульптурныя кампазіцыі Наваполацка».

28 студзеня ў музеі гісторыі Віцебскага народнага мастацкага вучылішча, размешчанага на вуліцы Марка Шагала ў Віцебску, адбылося святкаванне 100-гадовага юбілею першай навучальнай мастацкай установы на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Мастацкія працэсы, якія адбываліся ў Віцебску з 1918 па 1923 гады, значна паўплывалі на фарміраванне еўрапейскага сучаснага мастацтва. У ВНМВ выкладалі Марк Шагал, Казімір Малевіч, Эль Лісіцкі і інш. (*Витебские вести. – 2019. – 31 янв. – С. 23.*)

Музей гісторыі Віцебскага народнага мастацкага вучылішча ўвайшоў у шорт-ліст VII прэміі The Art Newspaper Russia у намінацыі «Музей года» за аднаўленне гістарычна важнага будынка і асветніцкую работу. Музей стаў першай установай Беларусі, заяўленай на прэстыжную прэмію. (*Витебские вести. – 2019. – 2 февр. – С. 8.*)

У Аршанскім музеі У. Караткевіча **ў студзені** працавала выстава «Духоўныя каштоўнасці малой радзімы», на якой былі прадстаўлены абразы і царкоўныя кнігі з Копыскага храма Праабражэння Гасподняга і фондасховішча Музейнага комплексу гісторыі і культуры Аршаншчыны.

У выставачнай зале Чашніцкага гістарычнага музея для ўдзельнікаў партызанскага руху і іх родных было праведзена мерапрыемства «Партызанская ёлка». Вечар-канцэрт падрыхтавалі калектывы аўтаклуба, раённага савета ветэранаў і музея.

У студзені ў Глыбоцкім раённым гісторыка-этнаграфічным музеі адкрылася выстава «Наш адрес – Советский Союз».

2 лютага ў г. п. Ветрына Полацкага раёна быў урачыста адкрыты помнік воінам 9-га асобнага аўтамабільнага батальёна, якія загінулі пры выкананні інтэрнацыянальнага абавязку ў Афганістане. (*Витебские вести. – 2019. – 5 февр. – С. 4.*)

МУЗЕЙНАЯ СПРАВА І АХОВА ПОМНІКАЎ

16–31 студзеня ў Расонскім музеі баявой садружнасці экспанавалася выстава «100 гадоў БССР: даты, падзеі, людзі».

У Музеі гісторыі і культуры г. Наваполацка ў **студзені-лютым** экспанавалася выстава з фондаў музея «БССР: через призму столетий» (да 100-годдзя абвяшчэння БССР). **5 студзеня** ў музейнай установе стартаваў новы культурна-асветніцкі праект «Дзень у гісторыі». Першая вечарына была прысвечана 90-годдзю з дня нараджэння Ганаровага грамадзяніна г. Наваполацка Пятра Міхайлавіча Пілатовіча.

22 студзеня ў Віцебскім абласным краязнаўчым музеі адкрылася перасоўная фотадакументальная выстава, прысвечанаю 100-годдзю з дня ўтварэння БССР. Акрамя стэндаў, якія адлюстроўваюць важныя этапы ў гісторыі Беларусі, у экспазіцыі былі прадстаўлены экспанаты, звязаныя з развіццём Прыдзвінскага краю.

Да 100-годдзя ўтварэння Беларускай ССР супрацоўнікі Шумілінскага гісторыка-краязнаўчага музея арганізавалі выставу «100 год БССР: погляд у мінулае» і правялі віктарыну для старшакласнікаў.

У Полацкім музеі беларускага кнігадрукавання **ў студзені** працавала выстава «Нам засталася спадчына», прымеркаваная да 100-годдзя абвяшчэння БССР. У экспазіцыі прадстаўлены матэрыялы з фондаў Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка.

У Бешанковіцкім раённым гісторыка-краязнаўчым музеі была арганізавана выстава «Наш родны край: 1946–1991 гады», прымеркаваная да 100-годдзя абвяшчэння БССР.

У ВАКМ **у студзені** адкрылася выстава абутку з калекцыі Муніцыпальнага музея імя Кавалера Вінчэнца Андольфі (Італія). Выстава дапоўнена касцюмамі XV–XVI стагоддзяў, якія насіла італьянская знаць, інфармацыйнымі стэндамі, аўдыя- і відэаматэрыяламі.

Прафесійных і пачынаючых даследчыкаў сабрала навукова-практычная канферэнцыя «Музей як месца сустрэчы мінулага і будучага»,

16 студзеня ў бібліятэцы былі праведзены пазачарговыя заняткі бясплатных курсаў «Віцебск: рэальная і папулярная гісторыя роднага горада» на тэму «Віцебскі трамвай: да 120-гадовага юбілею. Частка другая». З працягам сваёй лекцыі выступіў дырэктар Музея віцебскага трамвая Васіль Паўлючкоў.

17 студзеня для навучэнцаў 2 класа ДУА «Сярэдняя школа № 18 г. Віцебска» ў рамках літаратурных чытанняў «Я чытаю, ты чытаеш, мы чытаем!» адбылася сустрэча на тэму «Зіма – пара цудаў».

23 студзеня ў бібліятэцы ў рамках праекта «Чалавек Слова» адбылася творчая сустрэча з паэтэсай, загадчыкам літаратурнай часткі Беларускага тэатра «Лялька» Людмілай Сіманёнак.

24 студзеня ў бібліятэцы прайшла гадзіна гісторыі «Камсамол: час, падзеі, людзі», прысвечаная 100-годдзю ВЛКСМ.

24 студзеня адбыліся чарговыя заняткі бясплатных курсаў «Віцебск: рэальная і папулярная гісторыя роднага горада» на тэму «Віцебскае народнае мастацкае вучылішча: 100-годдзе школы Шагала». Лектар – доктар мастацтвазнаўства, прафесар Таццяна Катовіч.

24 студзеня аддзелам эканамічнай, тэхнічнай і сельскагаспадарчай літаратуры ў рамках праекта «Школа фінансавай граматнасці для дзяцей» для вучняў 3 «А» класа СШ № 2 былі праведзены пазнавальная гутарка і мультымедыйная прэзентацыя «Што такое грошы?».

29 студзеня для бібліятэкараў школьных бібліятэк г. Віцебска і Віцебскай вобласці ў рамках павышэння кваліфікацыі слухачоў Віцебскага абласнога інстытута развіцця адукацыі праведзена аглядная экскурсія па бібліятэцы. Супрацоўнікі аддзела дзіцячай літаратуры падрыхтавалі для калег адукацыйныя лекцыі «Эфектыўныя прыёмы работы з інтэрнэт-рэсурсамі для дзяцей» і «Традыцыйныя і інавацыйныя формы масавай работы з дзіцячым чытачом».

30 студзеня ў актавай зале бібліятэкі адбыўся рэспубліканскі круглы стол «На шляхах нацыянальна-дзяржаўнага самавызначэння»,

прымеркаваны да 100-годдзя стварэння Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі. У межах круглага стала былі абмеркаваны перадумовы, прычыны абвяшчэння і працэс утварэння ССРБ і ЛітБел, роля бальшавікоў-беларусаў у стварэнні беларускай дзяржаўнасці, лёсы першых кіраўнікоў Савецкай Беларусі, а таксама гістарычнае значэнне савецкага перыяду беларускай дзяржаўнасці. У рабоце круглага стала прынялі ўдзел дырэктар бібліятэкі Таццяна Адамян, галоўны спецыяліст упраўлення культуры Віцебскага аблвыканкама, кандыдат гістарычных навук, дацэнт Дзяніс Юрчак, віцебскія навукоўцы-гісторыкі Анатоль Дулаў, Іван Мандрык, Віктар Хаданёнак, загадчык аддзела навейшай гісторыі Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт Інстытута гісторыі НАН Беларусі Сяргей Траццяк, загадчык аддзела выкарыстання і публікацыі дакументаў установы «Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці» Уладзімір Каханка, старшыня Віцебскага гарадскога савета ветэранаў Ларыса Аленская. Удзельнікам мерапрыемства былі прадстаўлены віртуальная выстава дакументаў з фондаў Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці і кніжная выстава з фондаў абласной бібліятэкі.

5 лютага адбыўся абласны семінар дырэктараў раённых і гарадскіх сетак публічных бібліятэк Віцебскай вобласці «Публічная бібліятэка ў сучасным грамадстве». У семінары ўдзельнічалі галоўны спецыяліст ўпраўлення культуры Віцебскага аблвыканкама Зоя Гукава, дырэктар Віцебскай абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна Таццяна Адамян, кіраўнікі і спецыялісты ЦБС вобласці. Удзельнікі семінара пазнаёміліся з вынікамі работы рэгіянальнай сеткі публічных бібліятэк вобласці за 2018 год. Быў заслуханы даклад дырэктара Аршанскай ЦБС Аксаны Кулагінай пра новыя вектары развіцця публічных бібліятэк Аршанскага раёна. Асаблівая ўвага была нададзена пытанням парушэнняў заканадаўства аб барацьбе з карупцыяй, прычын і ўмоў, якія ім спрыяюць (па выніках праверкі пракуратурай вобласці ўстаноў культуры). Праведзена прэзентацыя мультымедыйнага рэсурсу «Турыстычныя маршруты Прыдзвіння» Віцебскай цэнтральнай раённай бібліятэкі. У рамках семінара адбыўся

ДУК «Шумілінская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

3 студзеня ў чытальнай зале ЦРБ быў праведзены відэалекторый «Гісторыя маёй краіны» для вучняў 10–11-х класаў СШ № 2 райцэнтра.

17 студзеня ў гарпасялковай бібліятэцы «Дабееўскі мох» прайшла літаратурная гульня «Веселые встречи с домовенком Кузькой».

23 студзеня ў чытальнай зале дзіцячай бібліятэкі прайшла гадзіна інфармацыі «Дети блокадного Ленинграда», прысвечаная 75-й гадавіне зняцця блакады Ленінграда.

5 лютага ў дзіцячай бібліятэцы было праведзена мерапрыемства да Дня юнага героя-антыфашыста «Маленькие герои большой войны» для вучняў 3-х класаў СШ № 1 райцэнтра.

10 лютага ў Слабадской бібліятэцы была арганізавана літаратурная квэст-гульня па творах В. Біянкі «Поднять паруса приключений».

16 лютага ў Обальскай гарпасялковай бібліятэцы прайшло мерапрыемства ў форме відэагадзіны «Максіму Гарэцкаму – 125!» для старшакласнікаў.

7 сакавіка работнікі ЦРБ прынялі ўдзел у свяце аграгарадка Мішневічы з праектом «Краеведческие маршруты библиобуса». Удзельнікам свята была прапанавана краязнаўчая прэзентацыя. Выстава «Тутэйшыя» была прысвечана вядомым ураджэнцам краю.

21 сакавіка адбыўся семінар бібліятэчных работнікаў, прысвечаны падрыхтоўцы да святкавання 75-годдзя вызвалення Беларусі і Шумілінскага краю ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Былі разгледжаны новыя формы работы па патрыятычным выхаванні моладзі.

29 сакавіка ў ЦРБ было арганізавана мерапрыемства да Дня праваслаўнай кнігі, у якім удзельнічалі свяшчэннаслужыцелі і царкоўны хор «Благовест».

ДУК «Шаркаўшчынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

У лютым у бібліятэках-філіялах сістэмы адбыўся шэраг мерапрыемстваў з удзелам воінаў-інтэрнацыяналістаў: патрыятычная гадзіна «Успомнім гэту вайну» (Верацееўская бібліятэка); «Афганістан. Яшчэ раз пра вайну» (дзіцячая бібліятэка); «Души, обожженные Афганистаном» (Васюкоўская бібліятэка).

Да Міжнароднага дня роднай мовы ў Германавіцкай бібліятэцы прайшоў турнір знаўцаў мовы «Падарожжа ў родную мову» паміж чытачамі сярэдняга школьнага ўзросту Германавіцкай і Вялікасельскай бібліятэк-філіялаў.

28 лютага ў раённай бібліятэцы прайшла прэзентацыя кнігі «У палоне кахання» члена Саюза пісьменнікаў Беларусі, удзельніка народнага літаратурна-мастацкага аб’яднання «Світанак» Міледзія Кукуця.

Тыдзень дзіцячай і юнацкай кнігі ў дзіцячай бібліятэцы пачаўся тэатралізаванай праграмай «Казкі пра Шаркаўград», якая прывяла дзяцей ў чароўны свет аўтарскіх казак і пазнаёміла з адным з герояў – прывідам дзіцячай бібліятэкі «Сімпацягам».

28 сакавіка для работнікаў ЦБС быў арганізаваны семінар «Роднаму краю – часцінку душы прысвячаю» на базе Германавіцкай бібліятэкі, якая ў бягучым годзе адзначае 100-гадовы юбілей. На семінар былі таксама запрошаны і мясцовыя жыхары: былы бібліятэкар Германавіцкай бібліятэкі Ірына Абламава, мясцовы краязнаўца Кліменцій Кожан, былы настаўнік Германавіцкай школы Іван Мядзелец. К. А. Кожан расказаў пра Язэпа Драздовіча, якога ведаў асабіста, пазнаёміў прысутных з гісторыяй станаўлення культурна-асветнага таварыства «Заранка», бо менавіта тады была заснавана бібліятэка з ахвяраваных выданняў і падтрымлівалася яна на сродкі таварыства. Кульмінацыйным момантам семінара стала прэзентацыя кнігі І. А. Мядзельца «Я люблю тебя, Ельня! Непутевые заметки экотуриста».

круглы стол «Бібліятэка і час: будучыня, якую мы ствараем», прысвечаны юбілейным датам бібліятэк вобласці.

8 лютага ў Канцэртнай зале «Віцебск» адбылася ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання лаўрэатаў абласной прэміі «Чалавек года Віцебшчыны–2018». Віцебская абласная бібліятэка прадставіла на мерапрыемстве бібліятэчную выставу, якая складалася з раздзелаў «100 год БССР: гісторыя, сучаснасць, лёсы» і «Кнігі дзяцінства: паміж мінулым і будучым».

Члены інтэлектуальнага клуба Віцебскага дзяржаўнага політэхнічнага прафесійнага ліцэя чарговае пасяджэнне клуба «Турнір валанцёраў» правялі ў Віцебскай абласной бібліятэцы. Яно прайшло ў рамках адкрыцця акцыі «Дапамога Віцебскаму прытулку бяздомных жывёл». Супрацоўнікі аддзела эканамічнай, тэхнічнай і сельскагаспадарчай літаратуры аказалі інфармацыйную падтрымку акцыі – афармілі тэматычную кніжную выставу «Заўсёды побач» і падрыхтавалі электронную прэзентацыю «Ва ўсіх павінен быць дом».

11 лютага ў аддзеле літаратуры па мастацтве ў рамках праекта «Музыка для ўсіх» адбылася лекцыя члена Беларускага саюза кампазітараў, музыканта, педагога Аляксандара Іванова «Жыццё ў музыцы», прысвечаная жыццёваму і творчаму шляху кампазітара, піяніста, педагога і грамадскага дзеяча Дзмітрыя Дзмітрыевіча Шастаковіча.

12 лютага ў бібліятэцы ў рамках праекта «На шляху да поспеху» адбылася сустрэча з арнітолагам Уладзімірам Іваноўскім – кандыдатам біялагічных навук, дацэнтам кафедры экалогіі і аховы прыроды ВДУ імя П. М. Машэрава.

13 лютага адбылося адкрыццё выставачнага праекта Галіны Васільевай «Constructio», прысвечанага 99-годдзю заснавання авангарднага мастацкага аб'яднання УНОВИС («Утвердители нового искусства»).

14 лютага адбыліся чарговыя заняткі бясплатных курсаў «Віцебск: рэальная і папулярная гісторыя роднага горада» на тэму «Чырвоная і

чорная кнігі Віцебска: аскепкі архітэктурнай спадчыны». Частка другая. Архітэктары Глеб Арлоўскі і Аляксандр Міхайлюкоў прадоўжылі ў сваіх выступленнях тэму архітэктурнай спадчыны горада.

19 лютага ў аддзеле літаратуры па мастацтве адбылося адкрыццё выставы ваенна-гістарычнай мініяцюры мастацтвазнаўцы, дацэнта кафедры дызайну мастацка-графічнага факультэта ВДУ імя П. М. Машэрава Ігара Гарбунова. У экспазіцыі больш за 200 арыгіналаў мініяцюр ручной работы.

20 лютага ў рамках цыкла мерапрыемстваў «Літаратурныя вечары» прайшла творчая сустрэча з паэтэсай Галінай Сіняковай.

21 лютага ў бібліятэцы адбылася традыцыйная літаратурна-музычная вечарына да Міжнароднага дня роднай мовы і агульная дыктоўка.

21 лютага супрацоўнікі агульнай чытальнай залы правялі для вучняў 3 «А» класа СШ № 2 літаратурны ўрок «Дзеці вайны», прысвечаны дзецям-героям Вялікай Айчыннай вайны і 75-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

27 лютага ў бібліятэцы ў рамках праекта «Астрахань – Віцебск: гісторыка-культурны дыялог» адбыўся Міжнародны круглы стол «20 гадоў работы ў прававым полі: вынікі, перспектывы», прымеркаваны да 20-годдзя Цэнтра публічнай інфармацыі Астраханскай абласной навуковай бібліятэкі імя Н. К. Крупскай.

27 лютага ў рамках святкавання Дня праваслаўнай кнігі ў бібліятэцы адбылася гутарка на тэму «Адраджэнне цвярозасці як хрысціянскай каштоўнасці», якую правёў старшыня Віцебскага епархіяльнага брацтва «Цвярозасць» дыякан Мікола-Георгіеўскага храма Віталь Вінакураў.

28 лютага ў бібліятэцы адбыліся чарговыя заняткі бясплатных курсаў «Віцебск: рэальная і папулярная гісторыя роднага горада» на тэму «Казімір Малевіч і канец класічнага мастацтва». Доктар мастацтвазнаўства, прафесар кафедры агульнай гісторыі і сусветнай культуры ВДУ імя

У рамках раённага міні-праекта «Мая радзіма – Ушаччына», важнейшым накірункам якога з'яўляецца ўвекавечанне памяці знакамітых землякоў, адкрыта інфармацыйная памятная дошка Еўдакіі Лось на месцы былой сядзібы паэтэсы.

14 сакавіка ў дзіцячай бібліятэцы была праведзена гадзіна пытанняў і адказаў для школьнікаў «Основной закон государства» да 25-годдзя Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

ДУК «Чашніцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

У раённай дзіцячай бібліятэцы-філіяле № 1 і Новалукомльскай дзіцячай бібліятэцы-філіяле № 4 **24 студзеня** адбыліся творчыя сустрэчы з дзіцячым пісьменнікам Валерыем Квілорыя.

З **20 лютага па 1 сакавіка** ў межах Адзінага дня бяспекі ў бібліятэках сістэмы былі праведзены мерапрыемствы: «За бяспеку – разам» (Новалукомльская гарадская бібліятэка); «Твая бяспека – твая адказнасць» (ЦРБ); «Ад сумлення не схавацца» (Альшанская сельская бібліятэка); «Мы – за бяспеку» (Іванская бібліятэка) і інш.

29 сакавіка бібліятэкары ЦБС сталі ўдзельнікамі семінара «Бібліятэчнае краязнаўства – тэрыторыя вялікіх магчымасцяў». Загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу В. М. Папко звярнула ўвагу калег на прыярытэтныя накірункі бібліятэчнага краязнаўства ў Год малой радзімы. Разглядаліся пытанні работы бібліятэк па мэтавых праграмах і выдавецка-краязнаўчай дзейнасці. Другая частка семінара была прысвечана тэме ўвекавечання памяці знакамітых землякоў Чашніччыны. Загадчык Новалукомльскай гарадской бібліятэкі Н. А. Каласоўская падзялілася вопытам работы народнага паэтычнага аб'яднання «Млын». Удзельнікі семінара пазнаёміліся з умовамі правядзення раённага краязнаўчага конкурсу прафесійнага майстэрства «Я – бібліятэкар! Я – экскурсавод!».

1 сакавіка ў ЦРБ прайшоў Дзень інфармацыі «Наркотики – билет в один конец».

6 сакавіка рамках літаратурна-эстэтычнага клуба «Наедине» ў ЦРБ быў арганізаваны вечар-камплімент «Самая обаятельная и привлекательная», на які былі запрошаны мамы, бабулі і дзеці ўдзельнікаў клуба і супрацоўнікаў устаноў культуры.

15 сакавіка 25-годдзю Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь у бібліятэках сістэмы прысвячаліся выставы «Главный закон белорусского государства», «Конституция моей страны», інфармацыйна-прававыя гадзіны «Конституция – основной закон государства», «Мы – граждане Беларуси», гадзіны прававых ведаў «Закон, по которому живём», «Права. Обязанности. Ответственность» і інш.

25–31 сакавіка ў бібліятэках праходзіў Тыдзень дзіцячай і юнацкай кнігі «Храм мудрости и доброты». Для юных чытачоў праводзіліся конкурсы, віктарыны, гульні, пазнавальныя прыгоды, вясёлыя падарожжы па старонках літаратурных твораў.

26 сакавіка ў ЦРБ прайшла сустрэча «Поэзия как волшебство» з удзельнікамі літаратурнага аб'яднання «Сузор'е».

ДУК «Ушацкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

11 студзеня работнікі Ушацкай дзіцячай бібліятэкі арганізавалі віртуальнае падарожжа «Великое слово «Спасибо» для траццякласнікаў сярэдняй школы райцэнтра.

19 студзеня ў Плінскай бібліятэцы прайшло пасяджэнне жаночага клуба «Сустрэча» для аматараў рукадзелля «Зимние посиделки».

1 сакавіка споўнілася б 90 год беларускай савецкай паэтэсе Е. Я. Лось, імя якой носіцьУшацкая раённая бібліятэка. З нагоды юбілею ў раённым Цэнтры культуры прайшло літаратурна-паэтычнае свята «Калі радок дыктуюць пачуцці», да якога была афармлена выстава «Валошка на мяжы». У ЦРБ адбылася літаратурная гасцёўня з удзелам сучасных самадзейных аўтараў Ушаччыны.

П. М. Машэрава Таццяна Катовіч прысвяціла лекцыю 140-годдзю з дня нараджэння Казіміра Малевіча.

28 лютага ў Публічным цэнтры прававой інфармацыі для ўдзельнікаў дзіцячага клуба «Правазнайка» прайшла інфармацыйна-прававая гадзіна «Я – грамадзянін Рэспублікі Беларусь».

4 сакавіка аддзел эканамічнай, тэхнічнай і сельскагаспадарчай літаратуры правёў інфармацыйную гадзіну «Гасударыня вялікая Масленіца» для студэнтаў з Туркменістана Віцебскага філіяла міжнароднага ўніверсітэта «МИТСО».

5 сакавіка ў бібліятэцы адбылася прэзентацыя зборніка матэрыялаў Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Женский подвиг в истории Беларуси. 1917–2017 годы». Канферэнцыя праходзіла 26 кастрычніка 2017 года на базе Віцебскай абласной бібліятэкі. Выданне зборніка стала магчымым дзякуючы ініцыятыве народнай артысткі Беларусі Святланы Акружной і фінансавай падтрымцы Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі.

5 сакавіка супрацоўнікі аддзела эканамічнай, тэхнічнай і сельскагаспадарчай літаратуры правялі майстар-клас «Букет з цукерак – цюльпаны».

5 сакавіка адбылося адкрыццё персанальнай выставы жывапісу члена Беларускага саюза мастакоў Аляксея Пшонкі «Скрыжаванне». У экспазіцыі прадстаўлены работы філасофскага плана, разважанні аўтара пра сэнс жыцця.

7 сакавіка ў фае бібліятэкі была разгорнута кніжная выстава «Жанчыны ў гісторыі і літаратуры: вялікія, знакамітыя і цудоўныя», прысвечаная Дню жанчын.

13 сакавіка ў бібліятэцы адбылася творчая сустрэча з галоўным рэдактарам выдавецтва «Мастацкая літаратура» Віктарам Шніпам і прадстаўнікамі выдавецтва. У рамках мерапрыемства прайшла прэзентацыя новай кніжнай серыі «100 вершаў». Асаблівая ўвага была

нададзена кнізе нашага земляка, народнага паэта Беларусі Генадзя Бураўкіна «Ніці лёсу», якая пабачыла свет у канцы 2018 года.

Сектар замежнай літаратуры прапанаваў увазе чытачоў выставу «З класікамі замежнай літаратуры – у юбілейны год бібліятэкі», прымеркаваную да 90-годдзя Віцебскай абласной бібліятэкі.

14 сакавіка ў бібліятэцы адбыліся чарговыя заняткі бясплатных курсаў «Віцебск: рэальная і папулярная гісторыя роднага горада» на тэму «Светаўспрыманне і светаадчуванне жыхароў Віцебска ў XII–XVII стст. (па матэрыялах раскопак Верхняга замка)». Лектар – вядомы беларускі археолаг Лявон Калядзінскі.

18 сакавіка была арганізавана творчая сустрэча з Людмілай Шаўцовай – лаўрэатам расійскай нацыянальнай тэлевізійнай прэміі «ТЭФИ», аўтарам дакументальных цыклаў на тэлеканале «Культура», сцэнарыяў гістарычных, мастацка-дакументальных фільмаў, якія ўвайшлі ў залаты фонд рускай культуры. З творчасцю Л. Шаўцовай прысутных пазнаёміў мастацкі кіраўнік Беларускага тэатра «Лялька», заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь Віктар Клімчук, якога з Людмілай Іванаўнай звязваюць сумесныя праекты.

19 сакавіка да 25-годдзя прыняцця Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і станаўлення інстытута прэзідэнцтва ў бібліятэцы для ўдзельнікаў дзіцячага клуба «Правазнайка» прайшоў прававы лікбез «Я – будучы выбаршчык».

20 сакавіка ў актавай зале бібліятэкі адбылася прэзентацыя кнігі доктара педагагічных навук, прафесара, дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Рамана Матульскага «Библиотеки Беларуси. Из прошлого в будущее. 1917–1991». У рамках прэзентацыі прайшла адкрытая лекцыя «Тэндэнцыі і асаблівасці развіцця кніжнай культуры Беларусі ў XI–XX ст. у кантэксце агульнаеўрапейскай гісторыі». У мерапрыемстве ўзялі ўдзел кіраўнікі і спецыялісты Віцебскай абласной бібліятэкі, сетак публічных бібліятэк Міністэрства культуры і ўніверсітэцкіх бібліятэк

вышыванка» (з цыкла мерапрыемстваў па творчай праграме «Аз і Букі беларускай культуры»).

24 сакавіка ў цэнтры чытання і актыўнай творчасці «Бібліяпазл» пры дзіцячай бібліятэцы імя Л. Талстога прайшлі творчыя заняткі ў групе «Чытанне з пялёнак» і арт-студыі «Казка ў фарбах».

26 сакавіка ў бібліятэцы-філіяле № 8 у рамках творчай праграмы «Юрыдычная азбука» была праведзена пазнавальнаягадзіна «Беларусь, мая мілая!», прымеркаваная да 100-годдзя заснавання БССР.

ДУК «Сенненская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

У студзені ў бібліятэках ЦБС прайшлі мерапрыемствы патрыятычнай накіраванасці: экскурс у гісторыю «100 гадоў БССР» (Багушэўская гарпасялковая бібліятэка); пазнавальны ўрок «З гісторыі стварэння БССР» (Нямойтаўская с/б); гадзіна патрыятызму «Ганаруся, што беларусам завуся» (Машканская с/б); гістарычны блок «БССР у гісторыі беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці» (Студзёнкаўская с/б).

16 студзеня гадзіна праваслаўя «Па старонках праваслаўнага календара» з удзелам святара была арганізавана работнікамі ЦРБ. На мерапрыемства, прысвечанае святам Нараджэння Хрыстова і Хрышчэння, былі запрошаны вучні старэйшых класаў.

Да 30-годдзя вываду савецкіх войскаў з Афганістана былі праведзены мерапрыемствы: «Афганскими дорогами войны» (ЦРБ); гадзіна памяці «Афганистан: героизм и трагедия XX века» (Багушэўская гарпасялковая бібліятэка); урок мужнасці «Афганистан болит в моей душе» (Яноўская сельская бібліятэка) і інш.

20 лютага ў дзіцячай бібліятэцы была арганізавана ваенна-патрыятычная гульня «Каждый парень воин бравый» да Дня абаронцаў Айчыны.

21 лютага работнікі ЦРБ правялі для старшакласнікаў інтэлектуальную гульню «Гавары са мной па-беларуску».

абаронцаў Айчыны; **21 лютага –** вечар «Не мы судьбу – судьба нас выбирала», прысвечаны 30-годдзю выводу савецкіх войскаў з Афганістана.

26 лютага ў бібліятэцы-філіяле № 8 навучэнцы 8-х класаў СШ № 16 сталі ўдзельнікамі ўрока мужнасці «Прайсці вайну і застацца чалавекам!», які для іх правёў ветэран унутраных войскаў, кавалер ордэна Мужнасці Аляксей Чакалін.

1 сакавіка ў дзіцячай бібліятэцы імя Л. Талстога для дзяцей 2 «А» класа СШ № 10 было праведзена мерапрыемства «Жыццёвай мудрасці мы вучымся ў кніг», прымеркаванае да Міжнароднага дня роднай мовы.

4 сакавіка ў бібліятэцы імя Я. Купалы адбылася духоўна-асветніцкая сустрэча з сёстрамі Полацкага Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра пад назвай «Святло праваслаўя на Полацкай зямлі».

6 сакавіка рэтра-вечарынай «Ёсць у сакавіку Жаночы дзень» адзначылі першае вясновае свята ў бібліятэцы імя А. Герцэна.

19 сакавіка з нагоды Тыдня дзіцячай і юнацкай кнігі ў бібліятэцы імя Я. Купалы адбылося літаратурае свята «Ни к чему нам интернет – лучше книги друга нет» у межах індывідуальнага творчага плана «С книгой мир добрей и ярче».

22 сакавіка ў ЦРБ імя Ф. Скарыны прайшла сустрэча з паэтам, удзельнікам літаратурнага аб'яднання «Наддзвінне» Пятром Буганавым.

21 сакавіка для навучэнцаў 9 класа Полацкага кадэцкага вучылішча быў падрыхтаваны агляд-разважанне «Духоўны подзвіг і служэнне Айчыне», прымеркаваны да Дня праваслаўнай кнігі. У мерапрыемстве з цыкла «Святы праваслаўнага каляндара» прыняў удзел кіраўнік аддзела Полацкай епархіі па сувязях з Узброенымі Сіламі протаіерэй Аляксандр Шаховіч.

21 сакавіка ў бібліятэцы імя Я. Купалы адбылася духоўна-патрыятычная гадзіна «Старонкі гісторыі Полацкай зямлі», прымеркаваная да Года малой радзімы.

20–22 сакавіка ў дзіцячай бібліятэцы імя Л. Талстога вучні 3-х класаў СШ № 10 здзейснілі этнаграфічную вандроўку «Мая кашуля-

Віцебска і Віцебскага рэгіёна. Бібліятэкам вобласці ў рамках дабрачыннай акцыі «Чытанне – прастора інфармацыі і ведаў» Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі перададзена ў дар больш за 950 асобнікаў літаратуры.

20 сакавіка прайшла прэзентацыя другога выдання кнігі паэта, музыканта, выкладчыка Міхаіла Рубіна «Каждому». Усе вершы з гэтай кнігі сталі песнямі, многія з якіх прагучалі на прэзентацыі ў выкананні аўтара. А вершы прачыталі Ніна Левінсон, Вольга Мацкевіч і Таццяна Палякова.

21 сакавіка ў нямецкай чытальнай зале адбылося метадычнае аб'яднанне настаўнікаў нямецкай мовы Першамайскага раёна г. Віцебска.

25 сакавіка ў рамках праекта «На шляху да поспеху» адбылася прэзентацыя кнігі дырэктара ТДА «Віцебскі бізнес-цэнтр» Леаніда Шура «БізнесМЕНтар Філін» – першага тома тэтралогіі «Матрыца Шура».

26 сакавіка прайшоў круглы стол «25-годдзе Асноўнага Закона Рэспублікі Беларусь: сучаснасць і перспектывы», які быў прысвечаны святкаванню 25-годдзя з дня прыняцця Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і станаўлення інстытута прэзідэнцтва. Арганізатарамі выступілі ўпраўленне культуры Віцебскага аблвыканкама і Віцебская абласная бібліятэка.

26 сакавіка адбылася першая сустрэча ў рамках праекта «Па старонках "Віцебскіх сшыткаў" з Людмілай Хмяльніцкай». Галоўны рэдактар альманаха Людміла Хмяльніцкая распавяла пра аўтараў альманаха, геаграфію даследчыкаў, склад матэрыялаў. Кандыдат мастацтвазнаўства Людміла Вакар расказала пра раздзел «Допісы на палёх», які быў у першых выпусках альманаха.

27 сакавіка ў аддзеле літаратуры па мастацтве ў рамках святкавання Міжнароднага дня тэатра адбылася сустрэча з навучэнцамі групы НС-III-21 рэжысёрскага курса УА «Віцебскі дзяржаўны каледж культуры і мастацтваў» і выкладчыкам, рэжысёрам, членам Беларускага саюза тэатральных дзеячаў Ігарам Баярынцавым.

27 сакавіка ў бібліятэцы ў рамках цыкла мерапрыемстваў «У коле сяброў» прайшоў творчы вечар доктара мастацтвазнаўства, прафесара Таццяны Катовіч і прэзентацыя яе кнігі «Рекорд/Спартак».

27 сакавіка для студэнтаў 1 курса факультэта эканомікі і права Міжнароднага ўніверсітэта «МИТСО» прайшоў прававы лекторый «На варце фінансавай бяспекі».

28 сакавіка ў рамках бібліятэчнага праекта «Разам!» адбыўся гумарыстычны вечар «Смех ад жывата», прысвечаны Дню смеху. Удзельнічалі інваліды па зроку і пажылыя людзі аддзялення дзённага знаходжання Тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Чыгуначнага раёна г. Віцебска, танцавальны калектыў «Залаты ўзрост» (кіраўнік Святлана Левіна).

28 сакавіка адбыліся чарговыя заняткі бясплатных курсаў «Віцебск: рэальная і папулярная гісторыя роднага горада» на тэму «Падарожжа ў краіну крывічоў». Перад слухачамі курсаў выступіў беларускі гісторык, археолаг, кандыдат гістарычных навук Мікалай Плавінскі, які займаецца археалагічнымі даследаваннямі пахавальных помнікаў крывічоў.

ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Віцебска»

10 студзеня бібліятэка імя М. Горкага запрасіла навучэнцаў СШ № 6 г. Віцебска на гадзіну шчырага дыялогу «Возвысим душу до добра», гасцямі якога былі айцец Аляксандр, ваенны святар 103-й мабільнай брыгады, і памочнік святара па рэлігійна-маральным выхаванні Ангеліна Вішнеўская.

17 студзеня для навучэнцаў першых класаў ДУА «Гімназія № 3 г. Віцебска імя А. Пушкіна» ў бібліятэцы імя У. Караткевіча было арганізавана віртуальнае падарожжа «Кніжная планета».

18 студзеня ДУА «Яслі-сад № 106 г. Віцебска» запрасіў да сваіх выхаванцаў супрацоўнікаў бібліятэкі імя П. Броўкі на чарговы ранішнік «Урокі роднай мовы».

25 студзеня ў ЦГБ імя М. Горкага адбылася літаратурная інфармацыйна-прапагандысцкая сустрэча са старшынёй Віцебскага

28 студзеня ў бібліятэцы-філіяле № 8 у рамках плана па прававой асвеце «Юрыдычная азбука» была праведзена пазнавальная гадзіна «Беларусь мая мілая!», прымеркаваная да 100-годдзя заснавання БССР. У рамках мерапрыемства адбылася прэзентацыя відэароліка, былі арганізаваны віктарыны «Знаўцы роднага краю», «Ці ведаеш ты гісторыю Полацка?».

1 лютага ў дзіцячай бібліятэцы імя Л. Талстога прайшоў інфармацыйна-гульнёвы трэнінг «Экстрэмальныя сітуацыі крымінальнага характару» з навучэнцамі СШ № 10.

1 лютага ў бібліятэцы-філіяле № 5 адбылося першае ў бягучым годдзе мерапрыемства ў рамках творчага праекта «Бібліяпадарожжа ў краіну Разумнікаў».

7 лютага ў дзіцячай бібліятэцы імя Л. Талстога з вучнямі 9 »А» класа СШ № 10 была праведзена гутарка-трэнінг «Мабільнасць у выбары прафесіі».

7 лютага на базе дзіцячай бібліятэкі імя Л. Талстога прайшло гарадское пасяджанне метадычнага аб'яднання школьных бібліятэкараў на тэму «Інфармацыйнае грамадства і дзіцячае чытанне».

7 лютага ў бібліятэцы імя Я. Купалы ў межах індывідуальнага творчага плана «Мой город – Родины частица» прайшоў літаратурны вечар-партрэт «Жыццё – як сюжэт для серыяла», прысвечаны 95-годдзю з дня нараджэння вядомага беларускага пісьменніка, Ганаровага грамадзяніна горада Полацка Алеся Савіцкага. На яго былі запрошаны вучні 8-х класаў СШ № 3.

13 лютага ў дзіцячай бібліятэцы імя Л. Талстога праходзіла акцыя «Дзень пісьменніка Крылова», прымеркаваная да 250-годдзя з дня нараджэння вядомага рускага байкапісца.

У ЦРБ імя Ф. Скарыны праведзены мерапрыемствы: **14 лютага –** медыяпрэзентацыя да Сусветнага дня бяспечнага інтэрнэту «Як не прапасці ў «Павуціне»?»; **17 лютага –** гадзіна мужнасці «Во славу Отчизны» да Дня

6 сакавіка дзіцячая бібліятэка імя У. Дубоўкі ў рамках пасяджэння клуба «Нашчадкі» правяла мовазнаўчую праграму «Чароўны клубочак», прысвечаную роднай мове.

15 сакавіка ў ЦРБ была праведзена інфармацыйная гадзіна «Прафілактыка неінфекцыйных захворванняў. На сустрэчу з чытачамі была запрошана галоўны ўрач раённага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі С. А. Рассеева.

ДУК «Полацкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

4 студзеня ў дзіцячую бібліятэку імя Л. Талстога на навагодняе свята «Інтрыгі Снежнай каралевы» былі запрошаныя дзеці з сацыяльнага цэнтра дзіцяці і са шматдзетных сем'яў.

3 студзеня ў бібліятэцы-філіяле № 8 прайшоў навагодні марафон у школе здароўя «Свята пажаданняў і надзей».

У Руднянскай сельскай бібліятэцы правялі калядныя вячоркі «Тихий час Рождества», на якіх прысутнічалі госці з літаратурнага аб'яднання «Наддзвінне».

14 студзеня ў дзіцячай бібліятэцы імя Л. Талстога адбыліся заняткі ў арт-студыі «Казка ў фарбах» пад назвай «У халодным царстве Снежнай Каралевы».

14 студзеня ў бібліятэцы імя Я. Купалы для вучняў 4 «В» класа ДУА «Сярэдняя школа № 8» прайшоў відэаўрок «Пра мужнасць, сумленнасць, сяброўства…», прысвечаны 115-годдзю з дня нараджэння Аркадзя Гайдара.

25 студзеня ў дзіцячай бібліятэцы імя Л. Талстога адбыліся заняткі ў творчай майстэрні «Казачная геаграфія» пад назвай «У пошуках Снежнай Каралевы, або Падарожжа ў Данію». Пакуль дзеці займаліся ў майстэрні, для іх бацькоў была праведзена кансультацыя «Казкатэрапія ў выхаванні гіперактыўных дзяцей».

абласнога аддзялення ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі» Т. І. Красновай-Гусачэнка «Большие дела Года малой родины», на якую былі запрошаны навучэнцы Віцебскага дзяржаўнага прафесійна-тэхнічнага каледжа машынабудавання імя М. Шмырова.

27 студзеня да 75-годдзя з дня поўнага зняцця блакады Ленінграда бібліятэка імя Л. Талстога правяла для вучняў 4 «Б» класа ДУА «Сярэдняя школа № 18 г. Віцебска» гадзіну гісторыі «Летопись блокадного Ленинграда».

У канцы студзеня ў бібліятэках горада прайшлі сустрэчы маленькіх чытачоў з папулярным беларускім дзіцячым пісьменнікам, лаўрэатам міжнародных літаратурных конкурсаў Валерыем Квілорыя.

Адкрыццё персанальнай выставы мастака Алега Кірушкіна і прэзентацыя яго кнігі «Лёс і адказнасць» адбыліся ў ЦГБ імя М. Горкага **1 лютага**.

У Сусветны дзень чытання ўслых для юных наведвальнікаў ЦГБ імя М. Горкага адбылася прэзентацыя паэтычнага зборніка Валянціны Шырынавай «Два кармана».

7 лютага работнікі ЦГБ імя М. Горкага запрасілі ўдзельнікаў вайны ў Афганістане і навучэнцаў СШ № 3 і СШ № 6 г. Віцебска на літаратурна-музычную кампазіцыю-прысвячэнне «Афганістан: без права на забыццё!».

15 лютага ў ЦГБ імя М. Горкага адбылася прэзентацыя новага рамана Вольгі Маслюковай «Я там, где ты».

27 лютага ў бібліятэцы імя У. Караткевіча для вучняў СШ № 34 г. Віцебска быў праведзены ўрок-папярэджванне «Каб агонь не стаў бядой».

Літаратурнае свята «Душой народжанае слова», прысвечанае 90-годдзю з дня нараджэння вядомай беларускай паэтэсы Еўдакіі Лось, адбылося **28 лютага** ў віцебскай бібліятэцы, якая ўжо 25 гадоў носіць яе імя. Да юбілею Е. Лось адкрылася адноўленая экспазіцыя «Люблю цябе, мой добры край».

1 сакавіка ў цэнтральнай гарадской бібліятэцы ў рамках літаратурна-адукацыйнага праекта «Многоточие» адбылася вечарына, прысвечаная земляку – пісьменніку і паэту, аўтару знакамітай аповесці-казкі «Старик Хоттабыч» Лазару Лагіну.

Забаўляльна-пазнавальны праект «Нескучная суббота» штотыдзень збіраў ў ЦГБ імя М. Горкага дзяцей і іх бацькоў.

12 сакавіка ў бібліятэцы імя У. Караткевіча прайшла прэзентацыя кнігі паэта, члена Беларускага літаратурнага саюза «Полацкая ветвь» Валянціны Шырынавай «Два кармана».

14 сакавіка ЦГБ імя М. Горкага запрасіла чытачоў на музычны партрэт «Неслучайный вальс», прысвечаны 105-годдзю з дня нараджэння кампазітара Марка Фрадкіна.

Віртуальныя экскурсіі «Легенды и истории малой Родины» праводзіла для навучэнцаў 5-х класаў СШ № 45 бібліятэка імя Е. Полацкай ў рамках праекта «Віцебск – мая малая Радзіма».

14 сакавіка ўрок псіхалагічнай дапамогі «Я не дазволю сябе крыўдзіць!» быў праведзены ў бібліятэцы імя У. Караткевіча.

У рамках міжнароднага творчага конкурсу «От Ганзы к Ганзе: взгляд юных», прымеркаванага да 39-х Міжнародных Ганзейскіх дзён Новага часу, у ЦГБ імя М. Горкага **16 сакавіка** адбыўся інтэлектуальны турнір «Ганза. Взгляд сквозь время…» з удзелам пяці каманд віцебскіх школьнікаў.

19 сакавіка ў бібліятэцы імя С. Маршака прайшло падарожжа па старонках часопіса «Вясёлка» разам з вучнямі 4 А класа СШ № 4.

20 сакавіка ЦГБ імя М. Горкага запрасіла ўдзельнікаў грамадскага аб'яднання пажылых людзей «Золотой возраст» і навучэнцаў ДУА «Віцебскі дзяржаўны політэхнічны каледж» на сустрэчу з полацкімі паэтамі Галінай Загурскай і Мікалаем Балдоўскім.

21 сакавіка ў бібліятэцы імя Я. Купалы прайшоў літаратурна-музычны вечар «Поэзию, как трепет сердца, никто не может отменить!» з удзелам віцебскіх паэтаў.

«Кніжны свет праваслаўя» і выстава жывапісных работ Дзмітрыя Віткоўскага «Беларусь духоўная». У дзіцячую бібліятэку на вусны літаратурны часопіс «Жывое слова мудрасці духоўнай» былі запрошаны выхаванцы Нядзельнай школы прыходу Міёрскай царквы.

У ЦРБ да 25-годдзя Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь была праведзена інфармацыйная гадзіна «Дзяржава – гэта мы!». Да мерапрыемства была падрыхтавана кніжная выстава «Галоўная кніга краіны».

У рамках Тыдня дзіцячай і юнацкай кнігі супрацоўнікі дзіцячай бібліятэкі запрашалі на свае мерапрыемствы выхаванцаў дзіцячых садкоў і школьнікаў, для якіх праводзілі экскурсіі, конкурсы, віктарыны, наведванне мультыклуба, знаёмілі з выставамі і бібліятэчным фондам.

ДУК «Пастаўская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

13 студзеня Лынтупская гарпасялковая бібліятэка правяла пасяджэнне аматарскага аб’яднання «Сяброўка», прысвечанае святкаванню Новага года па старым стылі.

27 студзеня ў Варапаеўскай гарпасялковай бібліятэцы прайшло пасяджэнне аматарскага клуба паэзіі «Брыганціна» пад назвай «О малой Родине стихами», прысвечанае Году малой радзімы. Былі запрошаны мясцовыя паэты, адбылася прэзентацыя новай кнігі Святланы Аліхвер-Івановай «Услед за сонцам».

14 лютага ў ЦРБ прайшоў урок права «Правовая неотложка» з удзелам супрацоўніцы натарыяльнай канторы Т. В. Берняковіч.

21 лютага да Дня роднай мовы дзіцячая бібліятэка імя У. Дубоўкі правяла акцыю – інфармацыйны святлафор «Родная мова мая».

22 лютага да Дня абаронцаў Айчыны прайшоў круглы стол «Есть такая профессия – Родину защищать» з удзелам навучэнцаў Пастаўскага прафесійнага каледжа.

22 сакавіка ў літаратурнай кавярні ЦРБ была праведзена інтэлектуальная гульня «Брэйн-рынг» па бяспецы жыццядзейнасці, якую правёў супрацоўнік бібліятэкі Аляксей Бахір сумесна з прадстаўнікамі МНС і аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Лёзненскага райвыканкама.

24 сакавіка ў літаратурнай кавярні адбылася прэм'ера зборніка песень і вершаў «Проза жизни» аўтара-выканаўцы, удзельніка народнага аматарскага літаратурнага аб'яднання «Пад абажурам» Вольгі Гудзелевай.

ДУК «Міёрская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

14 студзеня ў цэнтральнай бібліятэцы прайшло чарговае пасяджанне клуба «Бажэна» з нагоды святкавання Старога Новага года.

У дзіцячай бібліятэцы было праведзена гістарычнае падарожжа «Шляхамі стагоддзя», прысвечанае 100-годдзю ўтварэння БССР.

8 лютага ў дзіцячай бібліятэцы адбылася сустрэча з гасцямі з Латвіі: кіраўніком аддзела адукацыі, культуры і спорту Дагдскага краю Марыяй Міцкевіча, намеснікам старшыні Дагдскай краявай Думы Сандрай Вішкуры і загадчыкам клуба Эзенскага Дома культуры Айварам Бачкурам. На мерапрыемстве прысутнічалі вучні 5-х класаў СШ № 3 райцэнтра, выхаванцы і выкладчыкі школы мастацтваў і творчыя людзі горада.

20 лютага ў цэнтральнай бібліятэцы прайшла творчая сустрэча з пісьменнікам-земляком Міледзіем Кукуцем. Сустрэча была прысвечана выхаду ў свет новай кнігі аўтара «У палоне кахання».

28 лютага ў ЦРБ адбыўся вечар памяці «Што застанецца пасля мяне...», прысвечаны 95-годдзю з дня нараджэння Героя Сацыялістычнай Працы Пятра Пятровіча Кандрашова. Спецыяльна да гэтай сустрэчы работнікі бібліятэкі і раённага гісторыка-этнаграфічнага музея падрыхтавалі выставу «Воін. Хлебароб. Герой».

Да Дня праваслаўнай кнігі ў ЦРБ быў арганізаваны вечар-дыялог «Захоўвайце веру ў сэрцах ...», на якім па традыцыі прысутнічаў протаіерэй Віктар Вабішчэвіч. Да мерапрыемства былі падрыхтаваны кніжная выстава

21 сакавіка ў ЦГБ імя М. Горкага адбыўся дыялог «Свой путь мы выбираем сами» паміж вучнямі 6-х класаў СШ № 4 і кіраўніком дыяканічнага цэнтра Віцебскай дыяцэзіі Інай Касцюковіч. Да мерапрыемства, якое прысвячалася Дню праваслаўнай кнігі, была падрыхтавана тэматычная выстава.

Да акцыі «Гадзіна Зямлі» супрацоўнікі бібліятэкі імя У. Караткевіча **30 сакавіка** прымеркавалі ўрок экалагічнай пісьменнасці «Мы ўсе ў адказе за нашу планету».

ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Наваполацка»

Студзень у бібліятэках ЦБС распачаўся традыцыйнымі каляднымі мерапрыемствамі: канцэртам «В сиянии Рождественской звезды» народнага калектыву «Крылы» і ранішнікам «Свет небесного чуда» (ЦГБ); пазнавальна-забаўляльнай праграмай «Светлый праздник Рождества – нет прекрасней торжества!» (бібліятэка імя У. Караткевіча); урокам аптымізму «Рождественские встречи» для адзінокіх пажылых людзей і дзяцей-сірот (бібліятэка імя К. Сіманава); гадзінай праваслаўнай літаратуры «Рождества волшебные мгновенья» для выхаванцаў сацыяльнага прытулку (бібліятэка імя А. Пушкіна); фотавыставай «Новый год и Рождество в моей семье», прадстаўленай клубам сяброў культуры «Вытокі» (бібліятэка імя Я. Коласа).

Ладзілі бібліятэкі і мерапрыемствы, прысвечаныя Году малой радзімы. **10 студзеня** ў ЦБ імя У. Маякоўскага адкрылася выстава «Грани» народнага клуба «Рошва» (г. Полацк); **17 студзеня** адбылася прэзентацыя кнігі «Тайна времени» наваполацкай паэтэсы Тамары Кавалёвай; **29 студзеня** народны калектыў «Крылы» распачаў цыкл мерапрыемстваў «Малая радзіма – ды большай, здаецца, няма…» вечарам-канцэртам «Нізкі паклон табе, малая радзіма…». У гэты ж дзень ў бібліятэцы імя Я. Коласа адкрылася выстава «Малая радзіма. Мясціны, любыя сэрцу» студыі выяўленчага мастацтва «Вясёлка» Палаца дзяцей і моладзі г. Наваполацка, прысвечаная творам беларускага паэта і публіцыста, ганаровага грамадзяніна Полацка і Наваполацка Навума Гальпяровіча.

Міжнароднаму дню роднай мовы прысвяцілі свой канцэрт «Слаўна гучыць роднае слова на роднай зямельцы!» удзельнікі народнага калектыву «Крылы» ў ЦБ імя У. Маякоўскага. У бібліятэцы імя Я. Коласа прайшоў Тыдзень беларускай мовы «Чытай па-беларуску!», у рамках якога была праведзена літаратурна-музычная акцыя «Гучы, родная мова!». У бібліятэцы імя К. Сіманава гэтай падзеі было прысвечана пасяджэнне бібліятэрапэўтычнага клуба «Оранжевое настроение». Дзіцячая бібліятэка імя А. Пушкіна запрашала выхаванцаў дзіцячых садкоў горада на ўрокі роднай мовы «Чую, бачу, гавару». У бібліятэцы імя У. Караткевіча прайшла акцыя-урок «Шчырая, лагодная, мова наша родная!».

Дню абаронцаў Айчыны была прысвечана «Школа юного бойца» ў дзіцячай бібліятэцы імя А. Пушкіна. Супрацоўнікі бібліятэкі імя У. Караткевіча да гэтага свята правялі рыцарскі турнір «Богатырская смекалка», арганізавалі акцыю-віктарыну «С открытым сердцем, с добрым словом».

У лютым ЦБ імя У. Маякоўскага пачала рэалізацыю новага праекта для школьнікаў «Нескучные уроки в библиотеке».

5 сакавіка наведвальнікі ЦБ імя У. Маякоўскага ўжо традыцыйна сустрэліся з сёстрамі Спаса-Еўфрасіннеўскага жаночага манастыра. Тэма сустрэчы – «Святло праваслаўя на Полацкай зямлі».

У дзіцячай бібліятэцы імя А. Пушкіна да Дня праваслаўнай кнігі была аформлена кніжная выстава «Свет добра из-под обложки». Дню Канстытуцыі была прысвечана прававая гадзіна «Хочу и надо, могу и должен!».

У праграме Тыдня дзіцячай і юнацкай кнігі: тэатралізаванае прадстаўленне «Баба Яга ў краіне дарожных знакаў», квэст «Тайная комната» па кнігах пра Гары Потэра (дзіцячая бібліятэка імя С. Маршака); квэст «Агенты Колбафіржык» па творах Вольгі Нікольскай (дзіцячая бібліятэка імя А. Пушкіна); квэст «В тридевятом царстве, в Пушкинском государстве» (бібліятэка імя У. Караткевіча); квэст-гульні «Проделки пирата», «10 ступеней вниз… в книгохранилище», «Школа безопасности» (ЦБ імя У. Маякоўскага).

21 лютага супрацоўнікі ЦРБ далі старт патрыятычнаму марафону насустрач 75-годдзю аперацыі «Баграціён» і вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Яны наведалі Бабінавіцкі музей баявой славы, пабывалі на Ціхмянаўскай вышыні, адкуль у чэрвені 1944 года пачалося вызваленне Беларусі. Загадчык аддзела па рабоце з дзецьмі Вольга Пячонава правяла прэзентацыю сваёй кнігі «Непокорённая высота».

28 лютага ў літаратурнай кавярні ЦРБ адбылася прэзентацыя зборніка казак удзельніка народнага аматарскага літаратурнага аб'яднання «Пад абажурам» А. Я. Траццякова пад назвай «Дзядулевы казкі».

3 сакавіка ў літаратурнай кавярні ЦРБ прайшло свята «Милая, добрая, нежная», прысвечанае Міжнароднаму жаночаму дню 8 сакавіка. У гэты ж дзень у мастацкай галерэі адкрылася выстава «Мерцающее вдохновение». Мастачка Вера Якубеня прадставіла свае карціны, выкананыя ў тэхніцы «алмазны жывапіс».

14 сакавіка ў ЦРБ прайшоў Дзень праваслаўнай кнігі. У рамках мерапрыемства, на якое былі запрошаны святары Вячаслаў Пашкевіч і Расціслаў Страха, адбылася гадзіна духоўных зносін «Свет истины на страницах книг», якую наведалі навучэнцы сярэдняй школы № 1 г. п. Лёзна і чытачы бібліятэкі.

15 сакавіка, у дзень 25-годдзя Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, у ЦРБ адбылося ўрачыстае мерапрыемства, прысвечанае ўручэнню пашпартоў грамадзяніна Рэспублікі Беларусь юным лёзненцам, якія дасягнулі 14-гадовага ўзросту.

20 сакавіка ў Лёзненскай ЦРБ пабывала здымачная група Першага нацыянальнага канала. Карэспандэнт узяла інтэрв'ю ў загадчыка аддзела па рабоце з дзецьмі Вольгі Пячонавай, якая расказала аб рабоце бібліятэкі па ваенна-патрыятычным выхаванні ў рамках праектаў «Іх подзвіг жывы, непаўторны і вечны», «Октябрь. Лиозно. 43-й», «Победные вёрсты войны», «Багратион», прысвечаных 75-годдзю вызвалення Лёзненскага раёна і 75-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

«Славутыя імёны малой бацькаўшчыны» (гадзіна гісторыі ў рамках клуба «Познаю мир»).

У дзіцячай бібліятэцы **1 лютага** была праведзена пазнавальная экскурсія «Чудеса в болоте» (да Сусветнага дня водна-балотных угоддзяў); **5 лютага** адбылася літаратурная гульня «Забавы по Крылову» (да 250-годдзя з дня нараджэння байкапісца); **21 лютага** прайшла гадзіна мовазнаўства «Любі, шануй, ведай роднае слова» (да Міжнароднага дня роднай мовы).

11 сакавіка ў ЦРБ былі праведзены мерапрыемствы: «Канстытуцыя – сімвал эпохі» (інфарміна ў рамках «Бібліяграфічнага ліцэя») і гадзіна гісторыі «Славутыя імёны малой бацькаўшчыны» ў рамках клуба «Познаём мир» для людзей з абмежаванымі магчымасцямі.

26–29 сакавіка ў дзіцячай бібліятэцы праходзілі мерапрыемствы Тыдня дзіцячай кнігі «Книжный остров в лабиринте города».

29 сакавіка для бібліятэкараў сістэмы быў арганізаваны тэматычны семінар «Современные подходы и поиск новых форматов в организации досуга сельского населения».

ДУК «Лёзненская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

8 студзеня на кафедры праваслаўнай літаратуры ЦРБ прайшло свята каляднай елкі «Праздник святой, православный встретим мы в мире с добром!». У мерапрыемстве прынялі ўдзел Благачынны Лёзненскай акругі і настаяцель храма Узвышэння Святога Крыжа іерэй Вячаслаў, настаяцель храма Узнясення Гасподняга іерэй Расціслаў, сёстры міласэрнасці, выхаванцы школы пры Крыжа-Узвіжанскім храме, а таксама дзеці з сацыяльнага прытулку.

14 лютага ў літаратурнай кавярні ЦРБ прайшлі II Срэцінскія чытанні «Возвысим душу до добра». На мерапрыемстве была прадстаўлена выстава дзіцячых малюнкаў «Мир добра глазами детей», афармлены кніжныя выставы «Душа по капле собирает свет», «История православия Лиозненщины».

ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма Браслаўскага раёна»

2–31 студзеня ў ЦРБ праходзіў месячнік краязнаўства «Жыві ў вяках, мой родны край». На пасяджэнні падлеткавага клуба «Сучаснік» прайшло рэтра-падарожжа «Давай пройдем по городу пешком». Члены клуба «Сустрэча» запрасілі на мерапрыемства «Я ў гэтым горадзе жыву, я гэты горад ведаю» галоўнага захавальніка фондаў НДУК «Браслаўскае раённае аб’яднанне музеяў» Міхаіла Кахановіча.

13–16 студзеня ЦРБ, Відзаўская гарпасялковая і Слабодкаўская сельская бібліятэкі прынялі ўдзел у II міжнароднай акцыі «Читаем Григорьева вместе». Арганізатар акцыі – Пскоўская бібліятэка – цэнтр зносін і інфармацыі імя І. Грыгор’ева.

15 лютага ў Друеўскай бібліятэцы была праведзена гістарычная гадзіна «Рубцом на сердце лег Афганистан». У мерапрыемстве ўдзельнічалі ваеннаслужачыя пагранзаставы «Друя», вучні Друеўскай СШ, воін-інтэрнацыяналіст Васіль Бліноў.

21 лютага ў ЦРБ адбылася нарада бібліятэчных работнікаў, у рамках якой быў праведзены круглы стол «Публічныя бібліятэкі Браслаўскага раёна: вынікі дзейнасці і тэндэнцыі развіцця».

23 лютага ў дзіцячай бібліятэцы прайшла сустрэча з кіраўніком аддзела адукацыі, культуры і спорту Дагдскага краю Марыяй Міцкевіча і старшынёй беларускага таварыства «Вербніца» Таццянай Гагалінскай. Латвійскія госці прэзентавалі 30-метровы «Ковер Дагдского края» і ўнікальную калекцыю свечак.

14 сакавіка ў ЦРБ адбылася сустрэча настаяцеля царквы Успення Прасвятой Багародзіцы айца Міхаіла і падлеткаў з Браслаўскага супрацьтуберкулёзнага цэнтра ў рамках Дня праваслаўнай кнігі «Живое слово мудрости духовной».

21 сакавіка работнікі ЦРБ да Дня паэзіі арганізавалі літаратурную пляцоўку «Вясна ў творах рускіх паэтаў».

22 сакавіка ў ЦРБ была праведзена нарада бібліятэчных работнікаў сістэмы «Дзень прафесійных зносін». У праграме: гадзіна прававой дапамогі «Выход подскажет нотариус», арганізацыя работы куратараў па пытаннях ВІЧ/СНІД у публічных бібліятэках раёна, заняткі Школы камп'ютарнай граматнасці «ІТкет», дыялогавая пляцоўка «Прачытаем і абмяркуем» і інш.

23–31 сакавіка ва ўсіх бібліятэках сістэмы праводзіліся мерапрыемствы ў рамках Тыдня дзіцячай кнігі і музыкі.

ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма Верхнядзвінскага раёна»

4 студзеня ў народным клубе цікавых сустрэч «Сучаснік» прайшоў тэматычны вечар з элементамі тэатралізацыі «С новогодним настроеньем, с новогодним угощеньем».

15 студзеня супрацоўнікі цэнтральнай раённай і дзіцячай бібліятэк прадставілі ўвазе гасцей каляднага фестывалю «Подарок с небес» выставу-агляд «Рождества волшебные мгновенья…».

14 лютага на раённым мерапрыемстве «Время выбрало нас» у Верхнядзвінскім Цэнтры культуры і народнай творчасці бібліятэкарамі была прадстаўлена выстава-прагляд «Афганистан – наша память и боль», прысвечаная 30-годдзю вываду савецкіх войскаў з Афганістана.

«Валентинка – любимому писателю» – так называлася акцыя, якая прайшла ў дзіцячай бібліятэцы.

16 сакавіка ў рамках праекта «Весеннее прикосновение» цэнтральная раённая бібліятэка зноў прымала сваіх сяброў з Дагды. 6 латвійскіх майстроў на чале з начальнікам аддзела адукацыі, культуры і спорту Дагдскай краявой думы Марыяй Міцкевіча правялі майстар-класы па вырабе твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

У **лютым** былі праведзены тэматычныя вечары: «О тех, кому вечно будет 20» (ЦРБ), «Афганистан прошел по нашим душам» (Асінторфская сельская бібліятэка – цэнтр экалагічнай асветы).

25–26 сакавіка ў дзіцячай бібліятэцы для малодшых школьнікаў было арганізавана падарожжа ў краіну здароўя «Гигиена личная, самая отличная».

ДУК «Лепельская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

У студзені юбілеям пісьменнікаў былі прысвечаны: урок пазакласнага чытання «Дзяцінства, абпаленае вайной» да 90-годдзя І. Сяркова (Каменская сельская бібліятэка-музей Т. Кляшторнага); кніжная выстава да 100-годдзя А. Савіцкага «Спатканне з юбілярам» (Старалядненская с/б); кніжная выстава «І ў новым стагоддзі пісьменнік з намі» да 115-годдзя А. Якімовіча (Горская с/б); літаратурна-інтэлектуальная гульня «Знаёмцеся, дзеці, з Якімовічам Алесем» (Слабадская с/б); літаратурная віктарына «Про Тимура и его команду» (Бароўская с/б).

17 студзеня ў дзіцячай бібліятэцы была арганізавана відэаэкскурсія «Бярэзінскі біясферны запаведнік».

20 лютага ў ЦРБ былі праведзены вытворчая нарада і пашыраны Савет пры дырэктары «Бібліятэкі ДУК «Лепельская ЦБС» у 2018 годзе: перспектывы развіцця, магчымыя кропкі росту». Таксама адбыўся семінар-практыкум «Дзейнасць ПЦПІ ў бібліятэках Лепельскай ЦБС».

На працягу **лютага** ў ЦРБ адбыліся:

«Праваслаўныя іконы як сімвал веры» (заняткі ў рамках праграмы «Школа праваслаўя»);

«Афганистан…: дни, ушедшие в вечность» (гадзіна памяці ў рамках «Бібліяграфічнага ліцэя»);

«Нам есть чем гордиться и есть, что беречь» (урок мужнасці ў рамках «Подросткового меридиана»);

падрыхтавалі літаратурна-музычную імпрэзу «Пагавары са мною», якая адбылася 1 сакавіка ў ГДК.

28 лютага работнікі ЦРБ правялі інтэрактыўную гульню «Да роднай мовы і культуры крок зрабі» для падлеткаў.

ДУК «Докшыцкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

6 студзеня ў Барсукоўскай сельскай бібліятэцы быў арганізаваны калядны абрад «Наступілі Святкі – пачаліся Калядкі» сумесна з удзельнікамі клуба «Вытокі».

Таццянін дзень быў адзначаны конкурснай праграмай «Ужель та самая Татьяна?» у Бягомльскай гарпасялковай бібліятэцы імя П. Панчанкі і танцавальна-конкурснай праграмай «Дни студенчества прекрасны» ў Гарадзішчанскай сельскай бібліятэцы-клубе.

20 лютага – 1 сакавіка ў рамках акцыі «Единый день безопасности» ва ўсіх бібліятэках сістэмы былі афармлены тэматычныя паліцы.

21 лютага ў ЦРБ была праведзена інфармацыйная гадзіна «Каб бацькоўская мова непаўторнаю кветкай цвіла».

21 лютага ўсе бібліятэкі прынялі ўдзел у акцыі «Размаўляем па-беларуску.

23 лютага ў Бягомльскай гарпасялковай бібліятэцы імя П. Панчанкі была арганізавана гульня «Пасвячэнне ў рыцары».

ДУК «Дубровенская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

4 студзеня супрацоўнікі дзіцячай бібліятэкі арганізавалі тэатралізаваны абрад «Пришла Коляда – отворяй ворота» сумесна з фальклорным калектывам «Кудзеліца».

22 студзеня ў ЦРБ была праведзена краязнаўчая гадзіна «Зямля, дзе я жыву», на якую быў запрошаны краязнаўца А. Я. Гаўруцікаў.

ДУК «Віцебская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

2 студзеня ЦРБ запрасіла маленькіх і дарослых чытачоў на навагоднюю акцыю «Стань першым!».

5 студзеня ў Курынскай с/б прайшло мерапрыемства «Шлях, даўжынёй ў 100 гадоў», прысвечанае 100-годдзю заснавання БССР.

На працягу **студзеня** былі арганізаваны сустрэчы: з калекцыянерам і рэстаўратарам елачных цацак Наталляй Кавалёвай (Акцябрская с/б); з мясцовым паэтам Аляксандрам Траццяковым (Капцянская с/б); з дзіцячым пісьменнікам Валерыем Квілорыя (ЦРБ).

ДУК «Гарадоцкі культурна-асветніцкі цэнтр і сетка публічных бібліятэк»

13 студзеня ў Бычыхінскай сельскай бібліятэцы прайшла гадзіна беларускай казкі «Беларуская казка – розуму падказка» для дзяцей малодшага школьнага ўзросту.

15 студзеня ў рамках кафедры праваслаўнай літаратуры ў літаратурна-музычнай гасцёўні ДУК «Гарадоцкі культурна-асветніцкі цэнтр і сетка публічных бібліятэк» прайшоў калядны фестываль «Свет Вифлеемской звезды».

25 студзеня ў Пальмінскай сельскай бібліятэцы адбылася гадзіна смутку «И ужаснулась земля», прысвечаная Міжнароднаму дню памяці ахвяр Халакоста. Мерапрыемства наведалі вучні старэйшага і сярэдняга школьнага ўзросту.

9 лютага ў Верамееўскай сельскай бібліятэцы адбылося чарговае пасяджэнне жаночага клуба «Надежда» – бібліятэчныя вячоркі «Прощай, Зима-старушка».

15 лютага ў рамках клуба «Правовед», арганізаванага пры ПЦПІ цэнтральнай раённай бібліятэкі, была праведзена сустрэча з начальнікам Гарадоцкага ЗАГС М. В. Качанавай.

16 і 23 лютага работнікі ЦРБ прынялі ўдзел у раённым і абласным святах «Гарадоцкая лыжня – 2019» і «Віцебская лыжня-2019», якія адбыліся на лыжаролернай трасе ва ўрочышчы Вераб'ёвы горы ў Гарадку. Імі быў арганізаваны бібліятэчны панадворак.

5 сакавіка ў літаратурна-музычнай гасцёўні ДУК «Гарадоцкі культурна-асветніцкі цэнтр і сетка публічных бібліятэк» прайшла сустрэча-віншаванне «Весенний букет». Гучалі лірычныя вершы пра жанчын, пра вясну, пра маці ў выкананні ўдзельнікаў бібліятэчнага клуба зносін «Залаты ўзрост». Свае музычныя падарункі дарылі навучэнцы дзіцячай школы мастацтваў і цэнтра пазашкольнай работы. У фае была афармлена кніжная выстава «О женщине с любовью» і выстава творчых работ «Фантазии полёт и рук творенье» Тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва.

14 сакавіка ў ДУК «Гарадоцкі культурна-асветніцкі цэнтр і сетка публічных бібліятэк» адбыўся Дзень праваслаўнай кнігі. Жадаючыя маглі здзейсніць віртуальнае падарожжа «Свет праваслаўнай кнігі». Была прадстаўлена выстава-агляд «Духовной радости сиянье». **15 сакавіка** ў чытальнай зале прайшоў урок праваслаўя «Через книгу – к миру и согласию». Бібліятэкары аддзела дзіцячай і юнацкай літаратуры запрасілі вучняў малодшых класаў на ўрок міласэрнасці «Научи своё сердце добру».

29 сакавіка ў цэнтральнай бібліятэцы адбылася творчая сустрэча «Писателями не рождаются, ими становятся» з аўтарам папулярных жаночых раманаў Вольгай Маслюковай.

ДУК «Глыбоцкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

Мерапрыемствы **студзеня**:

У Марцыбылінскай сельскай бібліятэцы для вучняў сярэдніх класаў была падрыхтавана інфармацыйная гадзіна «Беларусь: учора і сёння»(да 100-годдзя ўтварэння БССР).

Гадзіну духоўнасці «Под сиянием Рождественской звезды» правялі бібліятэкары цэнтральнай раённай бібліятэкі для наведвальнікаў аддзялення дзённага знаходжання ТЦСАН «Крыніца».

Пасяджэнне падлеткавага клуба «Нашчадкі» ў Шунеўскай бібліятэцы было прысвечана жыццю і побыту беларусаў і прайшло ў форме этнаграфічнага ўрока «Хатка з матчынай душою».

Сябры дзіцячага клуба «Книговичок» сустрэліся ў Глыбоцкай дзіцячай бібліятэцы на гадзіне пазнанняў і адкрыццяў «Энциклопедии богатый мир».

У Глыбоцкай дзіцячай бібліятэцы ў рамках мэтавай праграмы «Неразлучные друзья – мама, папа, книга, я!» адбылося сямейнае свята «Крещенский свет над миром всходит….».

Да Года малой радзімы работнікі Падсвільскай гарпасялковай бібліятэкі прымеркавалі гадзіну мастацтва «Душа народа ў яго традыцыях», якая прысвячалася нематэрыяльным каштоўнасцям Глыбоцкага краю. Таксама ў бібліятэцы была арганізавана аўтограф-сесія «Шчасце штодзённых адкрыццяў», госцем якой стала пісьменніца Зоя Наваенка.

7 лютага ў ЦРБ адбылася сустрэча з беларускім кампазітарам і выканаўцам Аляксандрам Каралёвым, аўтарам кніг «Тры дзявяткі – 999» і «Чырвонае сонца».

Да 30-годдзя выводу савецкіх войскаў з Афганістана былі прымеркаваны ўрокі мужнасці «На той вайне, на чужой…», «Горкая памяць – Афганістан», «Рэха далёкіх гор», гадзіны памяці, гістарычныя ўрокі і інш.

Да Міжнароднага дня роднай мовы прайшлі бібліятэчныя акцыі «Роднаму слову – гучаць!», турніры знаўцаў роднай мовы, гадзіны роднага слова і інш.

27 лютага адзначыў сваё 65-годдзе вядомы паэт Алесь Жыгуноў. Бібліятэкары сістэмы арганізавалі да юбілею земляка гадзіны паэзіі, літаратурныя партрэты, дасье юбіляра, дні паэта. Супрацоўнікі ЦРБ